Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
13 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 109 (27719) Кошт 1800 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АБ'ЯДНАНЫЯ ЛЮБОЎЮ ДА РОДНАГА СЛОВА І ПЕСНІ

**Удзельнікам і гасцям XIV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі**

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з адкрыццём XIV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі.

Гэты прадстаўнічы культурны форум з гонарам выконвае пачэсную місію развіцця і папулярызацыі айчыннай літаратуры і музычнага мастацтва. На сцэнічных пляцоўках Маладзечна выступаюць самыя знакамітыя артысты, аб'яднаныя любоўю да роднага слова і песні. Адной з яго незабыўных старонак з'яўляецца конкурс маладых выканаўцаў, які адкрыў многім майстрам беларускай эстрады шлях на вялікую сцэну.

Сёлетні фестываль працягвае свае добрыя традыцыі і пашырае гарызонты, каб нагадаць нам лепшыя старонкі музычнай спадчыны і адкрыць новыя імёны сучасных кампазітараў, паэтаў і спевакоў. Яго разнастайная праграма, прысвечаная 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 45-годдзю легендарнага ансамбля «Песняры», стане яшчэ адным важкім укладам у патрыятычнае выхаванне грамадзян і ўмацаванне духоўнага адзінства народа.

Жадаю ўсім моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення, новых творчых здзяйсненняў, шчасця і дабрабыту, а ўдзельнікам конкурсу — паспяховых выступленняў.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# БОЛЬШ ПАЎНАВАЖКІМ І РЭЗУЛЬТАТЫЎНЫМ

## СТАНОВІЦЦА БЕЛАРУСКА-СЕРБСКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Да такой высновы прыйшлі прэзідэнты дзвюх краін Аляксандр Лукашэнка і Тамislaў Нікаліч, падсумоўваючы вынікі перамоў, праведзеных 12 чэрвеня ў Бялградзе. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі шырокі спектр пытанняў беларуска-сербскага супрацоўніцтва, у тым ліку перспектывы пашырэння ўзаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай сферы.**



Фота БЕЛТА.

«Мы гатовы да далейшага паступальнага развіцця адкрытых і дружалюбных адносін з Сербіяй, якімі па-сапраўднаму даражым. Сербскі народ назаўсёды застанецца для нас брацкім народам, якому Беларусь гатова падставіць плячо ў цяжкай сітуацыі»,— падкрэсліў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка адзначыў эфектыўнасць праведзеных перагавораў, па выніках якіх было падпісана восем двухбаковых дакументаў аб паглыбленні супрацоўніцтва ў розных сферах. Прэзідэнт Беларусі таксама падкрэсліў дружалюбны і брацкі характар двухбаковых адносін.

«Вакол яшчэ бушуе сусветны крызіс. Але войны і крызісы некалі заканчваюцца, і трэба да гэтага рыхтавацца. Нашы сённяшнія перагаворы былі накіраваны ў будучыню. Мы дамовіліся аб галоўным, што, ці гэта ў Еўразійскім саюзе, у Беларусі, Расіі, Украіне, іншых дзяржавах, ці гэта ў Сербіі і на Балканах, мы будзем працаваць разам і ад гэтага атрымліваць адпаведную выгаду»,— заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

За апошнія гады двухбаковы тавараабарот вырас амаль у чатыры разы, дасягнуўшы прыкладна $200 млн. «Мы дамовіліся, што ў бліжэйшы час мы ўсё ж дасягнем таго ўзроўню, аб якім дамаўляліся ў Мінску,— як мінімум $0,5 млрд»,— расказаў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, істотны патэнцыял двухбаковага ўзаемадзеяння ёсць у такіх сферах як паліўна-энергетычная, сельская гаспадарка, будаўніцтва, транспартная інфраструктура, навука, адукацыя і турызм. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Беларусь заўсёды падтрымлівала і падтрымлівае тэрытарыяльную цэласнасць Сербіі і вітае намаганні сербскага кіраўніцтва па нармалізацыі сітуацыі ў Косаве і Метохіі. У сваю чаргу беларускі бок разлічвае на больш плённае ўзаемадзеянне з Сербіяй у міжнародных арганізацыях.

Прэзідэнт Беларусі сказаў, што здзіўлены рэакцыяй Захаду на паведамленні аб сваім афіцыйным візіце ў Сербію. «Напярэдадні візіту сюды я пацікавіўся, якая рэакцыя еўрапейскай супольнасці, ЗША на мой візіт у Сербію. Я даўно зняў ружовыя акуляры, але тым не менш мяне ўразіла і здзівіла іх пазіцыя. Яны гатовы былі зрабіць усё, каб сарваць гэты візіт або зрабіць яго абсалютна непрыметным у Сербіі»,— заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы едзем да вас як людзі добрай волі, як браты. Мы хочам дапамагчы настолькі, наколькі мы можам гэта сёння зрабіць для нашых братоў. І што калі ў выніку гэтага візіту Сербія стане хоць крыху мацней, можа, багацей? Навошта супраць гэтага выступаць? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік беларускай дзяржавы.— Паўстае пытанне: што ж ставяць сабе мэтай вашы заходнія партнёры, з якімі вы ведзяце дыялог? Яны што, хочуць аслабіць Сербію яшчэ больш, ці ж яны хочуць дабра для сербскага народа? Калі хочаце дабра, то навошта перашкаджаеце?»

«Мы прыехалі сюды не супраць некага, а каб зрабіць максімум у нашых двухбаковых адносінах, не на шкоду нашым і вашым суседзям»,— падкрэсліў беларускі лідар. «Я гэтым самым хачу сказаць, што калі мы самі не вырашым свае праблемы, то большых памочнікаў і прыхільнікаў у гэтым свеце шукаць не трэба. А нас баяцца няма чаго. Мы можам па максімуме зрабіць многае»,— упэўнены Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў выключна брацкую прыроду беларуска-сербскіх адносін: «Упэўнены, што ні ў аднаго з вашых палітыкаў і грамадзян няма ні адзінага факта, каб папракнуць мяне або Беларусь у няшчырасці».

СТАР. 2

# ДАРОСЛЫЯ ДАЛЯГЛЯДЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**45-ы выпуск заслаўскай сярэдняй школы № 1 — гэта ўсяго 17 вучняў, з якіх толькі пяць дзяўчынак. Па традыцыі, у час развітальнага школьнага бала выпускнікі прыйшлі на старажытны вал да галоўнага духоўнага сімвала горада — Спаса-Праабражэнскай царквы. Класным кіраўніком учарашніх вучняў была настаўніца беларускай мовы і літаратуры Марына Сінькевіч (на фота крайняя злева) — выпускніца гэтай жа навучальнай установы, «залатая» медалістка. Сапраўдны прыклад таго, як трэба любіць радзіму, гісторыю, свой горад!**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль СІВАК, міністр транспарту і камунікацый:**
***«Планы па развіцці рэгіянальных пасажырскіх авіяперавозак у краіне ўпіраюцца ў наяўнасць паветраных суднаў. Аднак у бліжэйшы час рэгіянальныя авіяперавозкі плануецца развіваць. Мы вызначыліся з тыпам паветраных суднаў для гэтых мэт. Гэта будуць чэшскія самалёты маркі L410 — універсальныя двухматорныя машыны на 19 месцаў кожная. Наогул рэгіянальныя авіяперавозкі пасажыраў былі ў нас спынены ў пачатку 2011 года. Летась Міністэрства транспарту і камунікацый даручыла «Белавія» прапрацаваць праект па аднаўленні ўнутрырэспубліканскіх паветраных зносін. 11 чэрвеня кампанія адкрыла рэйс Мінск — Гомель — Калінінград. Пакуль гэты рэйс уводзіцца на летні перыяд».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10150,00 | ▲ |
| Еўра | 13740,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 295,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 868,26 | ▼ |

■ Філасофія дапамогі

# ЖЫЦЬ СВАБОДНЫМ АД БОЛЮ

**У 2000 годзе ў ЗША правялі даследаванне, якое ахапіла 300 пацыентаў са смяротнымі захворваннямі і членаў іх сем'яў. У пацыентаў пыталіся, што для іх найбольш важнае. «Быць свабоднымі ад болю, знаходзіцца ў згодзе з Богам, адчуваць значнасць уласнага жыцця і прысутнасць сям'і», — адказалі цяжка хворыя людзі. Яны жадаюць, каб ім шчыра расказвалі пра іх лячэнне. Таксама яны хацелі б прывесці перад смерцю ў парадак свае справы, вырашыць усе канфлікты і спакойна памерці дома. Заснавальніца сучаснай хоспіснай медыцыны Дэйм Сісэлі Сандэрс, якая прымусіла ўвесь свет па-іншаму паглядзець на смяротна хворых людзей і іх боль, казала: «Вы важныя таму, што вы ёсць. І мы зробім усё, што толькі магчыма, для таго, каб дапамагчы вам пайсці з мірам, а таксама для таго, каб вы якасна жылі да самага апошняга моманту жыцця».**



## Маштабы праблемы

Першыя хоспісы, як месца, дзе даглядалі смяротна хворых людзей, з'явіліся ў Ірландыі яшчэ ў XIX стагоддзі. Але пастулаты паліятыўнай дапамогі былі сфармуляваны толькі ў другой палове XX стагоддзя. У 1967 годзе адкрыўся першы хоспіс у Лондане, а ў 1974 годзе — у ЗША.

Першапачаткова паліятыўная дапамога арыентавалася ва ўсім свеце на анкалагічных хворых, але затым прыйшло разуменне, што кола пацыентаў, якім патрабуецца паліятыўная дапамога, значна шырэйшае. Патрэбу ў паліятыўнай дапамозе маюць пацыенты з хранічнымі захворваннямі органаў кровазвароту, цэрэбраваскулярнымі захворваннямі, траўматычнымі пашкоджаннямі, пацыенты з ВІЧ/СНІД у пятай стадыі захворвання і іншыя.

СТАР. 6

# ШАНАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ І ПРЫМНАЖАЦЬ СПАДЧЫНУ

**Завяршыў сваю працу IX Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні: рэаліі глабальнага свету». Учора прадстаўнікі міжнароднай журналісцкай супольнасці з многіх краін свету, айчынных сродкаў масавай інфармацыі правялі эксперт-сесію «Міншчына гасцінная». Вядомыя публіцысты, палітолагі, кіраўнікі газет, часопісаў, тэлевізійных каналаў, інфармацыйных агенцтваў пазнаёміліся з цэнтрам экалагічнага турызму «Станькава» ў Дзяржынскім раёне. Вітаў гасцей старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён Шапіра.**

СТАР. 2



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Хлеб-соль гасцям ад гаспадароў.**

■ Надвор'е

## Пасвяжэе да дрыжыкаў

**У пятніцу тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў не зусім цёплай, але даволі вільготнай паветранай масы, якая рухаецца з боку Балтыйскага мора, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Холад будзе гаспадарыць у нас і ў выхадныя. Часам будуць ісці дажджы, а месцамі магчымы навальніцы. Уначы плюс 7-12 градусаў, удзень у суботу і нядзелю — толькі 14-20 цяпла.

У першыя тры дні наступнага тыдня да нас працягне паступаць холад з поўначы Еўропы. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы, а раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Уначы пахаладае да дрыжыкаў — чакаецца толькі плюс 4-11 градусаў, але ўдзень сонца прагрэе паветра да 15-21 цяпла. Сіноптыкі падлічылі, што такі тэмпературны рэжым у першы месяц лета на 2-4 градусы ніжэй за кліматычную норму чэрвеня.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ВЫБУХ НА ШАХЦЕ: ЛЁС ДЗЕВЯЦІ ГАРНЯКОЎ НЕВЯДОМЫ

У ноч на чацвер у горадзе Кіраўскае Шахцёрскага раёна Данецкай вобласці на адной з шахтаў на глыбіні 300 метраў адбыўся выбух газапаветранай сумесі. У той час у шахце знаходзіліся дзевяць гарнякоў. Лёс шахцёраў невядомы, іх шукаюць выратавальнікі. Як адзначыў прадстаўнік Міністэрства энергетыкі і вугальнай прамысловасці, гэта была незаконная здабыча вугалю на так званай «копанцы».



### ЕЎРОПА БЕЗ ШАШАЧАК

Таксісты шэрагу найбуйнейшых гарадоў Еўропы правялі акцыі пратэсту супраць папулярнага анлайн-сэрвісу выкліку таксі Uber, паведамляюць інфармагенцтвы. Прычынай забастоўкі паслужыў той факт, што кіроўцам таксі неабходна атрымліваць ліцэнзію, кошт якой дасягае 270 тыс. еўра, у той час як кіроўцы службы Uber абыходзяцца без яе. Акцыі пратэсту прайшлі ў Лондане, Парыжы, Мадрыдзе, Барселоне, Берліне, Гамбургу, Мюнхене, Рыме, Мілане. У брытанскай сталіцы гэты страйк стаў найбуйнейшым у гісторыі горада: у ім узялі ўдзел 12 тысяч кіроўцаў таксі. Акцыя пачалася з блакіравання Трафальгарскай плошчы, аднак пазней мітынгоўцы перакрылі і іншыя цэнтральныя магістралі Лондана. Кампанія Uber была створана ў 2009 годзе. Сёння яе паслугі даступныя ў 115 гарадах свету.

### ГАРАДСКІ ШУМ КАЛЕЧЫЦЬ СУЧАСНЫХ ЛЮДЗЕЙ

Пастаянны шум, які выклікаюць дарогі, самалёты, гучная музыка і гукі горада, павышае рызыку атлусцення і хвароб сэрца, піша Business Standard са спасылкай на адкрыццё навукоўцаў Каралінскага ўніверсітэта. Чым большы шум ад дарогі, тым большы аб'ём таліі мясцовых жыхароў. Так, аб'ём таліі павялічваўся амаль на 1 сантыметр з кожным павышэннем узроўню шуму на 10 дэцыбелаў. Ад шумавога «забруджвання» горада пакутавалі нават дзеці. Шум уплывае на стрэсавыя гармоны, уключаючы картызол. А гэта павышае рызыку павелічэння тлушчавых адкладаў у вобласці таліі.



ISSN 1990 - 763X
14109
9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### FORD ПАЧНЕ ВЫТВОРЧАСЦЬ АЎТАМАБІЛЬНЫХ ДЭТАЛЯЎ З ПАМІДОРАЎ

Аўтамабільная карпарацыя Ford Motor і харчовая кампанія Heinz дамовіліся аб супрацоўніцтве. Гігант амерыканскага аўтапрама збіраецца выкарыстоўваць сухія скуркі памідораў, якія застаюцца пры вытворчасці кетчупу, для стварэння пластыкавых дэталяў для машын, піша часопіс Time. На думку аўтараў праекта, прымяненне пластыку, выробленага на біялагічнай аснове, будзе садзейнічаць скарачэнню выкарыстання нафтапрадуктаў, а таксама дапаможа знізіць негатыўнае ўздзеянне аўтамабілебудаўнічай прамысловасці на навакольнае асяроддзе. Выгада для Heinz таксама відавочная: кампанія атрымае магчымасць пазбавіцца ад прамысловых адходаў, адзначае The Wall Street Journal. Калі аўтамабілі з «памідорнымі» дэталямі паступяць у продаж, невядома.

КОРАТКА

Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў 15-16 чэрвеня наведае з рабочым візітам Беларусь.

У бліжэйшай перспектыве падатак на дармаедства ў Беларусі ўводзіцца не будзе.

Граніца Беларусі і ЕС — адна з самых бяспечных, заявіла кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Майра Мора на дзясятым пасяджэнні рабочай групы па інтэграваным кіраванні граніцамі ў рамках ініцыятывы ЕС «Усходняе партнёрства».

У гэтым годзе дзяржаўны пагранічны камітэт Беларусі плануе ўвесці электронную чаргу для перавозчыкаў грузаў у пункце пропуску «Казловічы» на граніцы з Польшчай. У наступным годзе электронная чарга з'явіцца і на пункце пропуску «Каменны Лог».

■ Прыемная навіна

### УВОСЕНЬ ЗАРПЛАТЫ МЕДЫКАЎ ЗНАЧНА ПАВЯЛІЧАЦЦА

**Работнікам медыцынскай сферы восенню павысяць заработную плату. Пра гэта ўчора паведаміў міністр аховы здароўя Беларусі Васіль ЖАРКО.**

Сёння сярэднямесячная зарплата медработнікаў складае 4 млн 290 тыс. рублёў, у дактароў — 6 млн 400 тыс. рублёў, у сярэдніх медработнікаў з улікам сумяшчэнняў — 4 млн 300 тыс. рублёў. Планавалася, што заробак медработнікаў павялічыцца з 1 ліпеня. Але, па словах міністра, у ліпені ў сувязі з пачаткам адпускной пары павелічэнне зарплаты не атрымалася б зрабіць настолькі значным, як хацелася. Увосень Васіль Жарко абяцаў істотна павысіць зарплату. «Яна будзе значна вышэйшая за цяперашнюю»,— заявіў міністр.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# «ЭКАНОМІКУ ТУТ РАСТЛУМАЧАЦЬ НАВАТ «НА ПАЛЬЦАХ»

**Старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ:**



«Звязду» па-сур'ёзнаму я для сябе адкрыў прыкладна 15 гадоў таму, адразу пасля таго, як у ёй пачалі друкавацца першыя аналітычныя матэрыялы па тэматыцы жыллёвага будаўніцтва. Потым у старэйшым беларускамоўным выданні з'явіліся сапраўды сур'ёзныя артыкулы, дзе на высокім прафесіянальным узроўні прасочваліся апошнія тэндэнцыі ў сферы нерухомай маёмасці і другаснага рынку жылля.

Мне прыемна канстатаваць, што цяпер рэпарцёры газеты не проста расказваюць пра тыя ці іншыя эканамічныя падзеі і пералічваюць кошты на тавары і паслугі, але і прымушаюць чытачоў самастойна разважаць і адказваць на пастаўленыя журналістамі пытанні. Адзначу і тое, што за апошні год у «Звяздзе» сталі больш выкарыстоўваць комплексны падыход пры асвятленні канкрэтных эканамічных напрамкаў, якія сапраўды цікавяць людзей. Я маю на ўвазе тэматычныя палосы аб іпатэцы, нюансах па спажывецкіх пазыках і мікракрэдытах, а таксама матэрыялы пад рубрыкай «Фінансавы выдатнік».

Асобна хачу падкрэсліць новы напрамак эканамічнай аналітыкі, які прапануецца чытачам у выглядзе свабодных разважанняў двух журналістаў газеты. Падобныя «размовы на кухні» (часам з юнацкім максімалізмам і самаіроніяй) уздымаюць даволі актуальныя і сур'ёзныя праблемы. Больш за тое, у такіх «размовах» шмат чаго цікавага можна даведацца, калі чытаць іх не толькі «ў лоб», але і паміж радкоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БОЛЬШ ПАЎНАВАЖКІМ І РЭЗУЛЬТАТЫЎНЫМ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы заўсёды з найвялікшай павагай ставіліся да сербскага народа, таму што гэта наш народ, народ шматпакутны, народ-пераможца, які ўнёс велізарны ўклад у вызваленне Еўропы ад карычневай чумы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Сербіі Таміслаў Нікаліч у сваю чаргу заявіў, што разлічвае на штуршок у развіцці двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, які надасць гэты візіт кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі. Ён падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за дапамогу ў стварэнні на тэрыторыі Сербіі сумесных вытворчасцяў, рабочых месцаў і пашырэнні рынку збыту. Паводле яго слоў, бакі могуць атрымаць узаемную карысць як ад членства Беларусі ў Еўразійскім эканамічным саюзе, так і ў перспектыве ад членства Сербіі ў Еўрасаюзе. Ён таксама падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за дапамогу беларускага боку ў пераадоленні наступстваў нядаўняга стыхійнага бедства. Ён падкрэсліў, што народы дзвюх краін звязваюць выключна дружалюбныя і брацкія адносіны.

У кантэксце будучага старшынства Сербіі ў АБСЕ ў 2015 годзе прэзідэнты выказалі гатоўнасць дзвюх краін пашыраць узаемнае супрацоўніцтва ў рамках гэтай еўрапейскай арганізацыі ў мэтах забеспячэння раўнапраўнага і збалансаванага дыялогу па пытаннях бяспекі і супрацоўніцтва пры захаванні прынцыпаў, на якіх грунтуецца Хельсінкскі заключны акт, а таксама ў якасці асноўнага — прынцыпу кансэнсусу», — гаворыцца ў прынятай учора ў Бялградзе сумеснай заяве прэзідэнтаў дзвюх краін. Прэзідэнты таксама выказаліся на карысць далейшага павышэння эфектыўнасці АБСЕ і прадаўжэння працэсу яе міжнародна-прававога афармлення.

■ Парламенцкі дзённік

# НЕ ЎСЯКІ ГРОШ ХАРОШ

## БАНКАМ ПРАДАСТАВЯЦЬ ПРАВА РАЗРЫВАЦЬ АДНОСІНЫ З СУМНІЎНЫМІ КЛІЕНТАМІ

**Учора адбылося пасяджэнне Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Адзін з самых цікавых законапраектаў, які ўхвалілі сенатары, — «Аб захадах па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння».**

### Іх тут не «адмыеш»

Распрацоўка дакумента абумоўлена неабходнасцю прывядзення беларускага заканадаўства ў сферы працідзеяння легалізацыі злачынных даходаў і фінансавання тэрарызму ў адпаведнасць са стандартамі ФАТФ — міжурадавай арганізацыі па барацьбе з адмываннем грошай. Як растлумачыў **дырэктар Дэпартамента фінансавага маніторынгу Камітэта дзяржаўнага кантролю Аляксандр МАКСІМЕНКА,** беларуская банкаўская сістэма шчыльна інтэгравана ў сусветную сістэму банкаў, таму ў Беларусі патрабаванні ФАТФ павінны выконвацца. Дарэчы, летась з выкарыстаннем інфармацыі Дэпартамента фінансавага маніторынгу выяўлена 420 злачынстваў, накладзена адміністрацыйных штрафаў і даналічана да выплаты падаткаў на суму 302 млрд рублёў, спагнана ў бюджэт 122 млрд. «У тым ліку быў прыпынены рух грашовых сродкаў з іншых краін праз Беларусь», — адзначыў Аляксандр Максіменка. Акрамя таго, былі прыпынены аперацыі, накіраваныя на вывад грашовых сродкаў з краіны. У верасні адпаведная сума склала 11 млрд рублёў, у ліпені — 8 млрд. «Гэта адзінкавыя аперацыі», — удакладніў спецыяліст.

Што тычыцца фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці, па словах Аляксандра Максіменкі, былі сітуацыі, калі ў некаторых банкаўскіх кліентаў супадалі прозвішчы, імёны, некаторыя пашпартныя звесткі з тымі, хто пазначаны ў спісе тэрарыстаў і знаходзіцца на асаблівым кантролі: «Аперацыі прыпыняліся, але за апошнія тры гады такая інфармацыя не пацвярджалася».

Асноўная навела законапраекта ў тым, што банкі ў Беларусі змогуць прыпыняць здзелкі, адмаўляць у іх або разрываць адносіны з сумніўнымі кліентамі пры ажыццяўленні фінансавых аперацый. Напрыклад, банкі будуць надзелены правам на двое сутак прыпыніць здзелку — за гэты час фізічная або юрыдычная асоба будзе праверана. Калі здзелка з'яўляецца легальнай, фінансавая аперацыя працягнецца ў штатным рэжыме. Права разрываць адносіны з сумніўнымі кліентамі будзе прадастаўлена ўсім банкам (дзяржаўным і прыватным) і пазабанкаўскім арганізацыям, якія праводзяць фінансавыя аперацыі як з юрыдычнымі, так і з фізічнымі асобамі. Гэта ўсё робіцца для таго, каб мінімізаваць рызыкі. «У суткі праз нашу банкаўскую сістэму праходзіць прыблізна 55 трлн рублёў. Гэта каля паловы рэспубліканскага бюджэту, — адзначае **Аляксандр ЯКАБСОН, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю.** — Немагчыма такую масу грошай сіламі фінансавай разведкі адсачыць і праверыць. Таму мы даём магчымасць і паўнамоцтвы банкам самастойна правяраць такіх кліентаў. Для празрыстага бізнесу ўсё гэта не будзе мець ніякіх наступстваў».

### Дадатковыя паўнамоцтвы для судовых выканаўцаў

Яны прадугледжаны праектам Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях удасканалення грамадзянскага судаводства». Яго таксама разгледзелі ўчора беларускія сенатары. **Намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Галіна ПАДРАЗЁНАК** заявіла: «Законапраект пашырае паўнамоцтвы судовага выканаўцы. Ён будзе мець права аб'яўляць у вышук даўжніка, уваходзіць у жылыя памяшканні і на зямельны ўчастак у прысутнасці панятых і ў суправаджэнні прадстаўнікоў органаў унутраных спраў без згоды на гэта даўжніка, калі апошні перашкаджае ўваходжанню ў жылое памяшканне». Надзяленне дадатковымі паўнамоцтвамі судовых выканаўцаў дазволіць аператыўна і ў тэрмін спаганяць з даўжніка сродкі падчас выканаўчай вытворчасці.

Акрамя таго, законапраектам вызначаюцца асаблівасці разгляду скаргаў грамадзян на вынесенае ў дачыненні да іх папярэджанне аб магчымасці накіравання ў лячэбна-працоўны прафілакторый, скаргаў грамадзян, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, на пастанову аб ужыванні да іх мер спагнання. Акрамя таго, уводзяцца палажэнні, што рэгулююць вытворчасць па заяве аб адмене рашэння працоўнага арбітражу, удакладняюцца правы і абавязкі бакоў у выканаўчай вытворчасці і іншыя.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■



# ШАНАВАЦЬ ТРАДЫЦЫІ І ПРЫМНАЖАЦЬ СПАДЧЫНУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Невыпадкова арганізатары форуму выбралі гэтае месца для працягу размовы па самых сур'ёзных пытаннях. Беларусь рыхтуецца да 70-годдзя вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І ў кантэксце гэтай падзеі, а таксама трывожных падзей у свеце, у блізкім замежжы як ніколі актуальнай з'яўляецца ўвага да патрыятычнай, гуманістычнай, міралюбавай праблематыкі ў СМІ.

— Нам цікава было адкрываць Беларусь шматпланавую, шматаблічную, — дзеліцца сваімі ўражаннямі **старшыня праўлення Міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Казінфарм» Даўрэн ДЗІЯРАЎ.** — Кіраўнік Міншчыны Сямён Барысавіч Шапіра распавёў пра выдатны плён аграрнікаў Беларусі. Ваш прыклад прафесійнага стаўлення да АПК уражвае, натхняе, многаму вучыць. І ўвогуле мы ўражаны высокай арганізацыяй правядзення форуму. Мы наноў успомнілі той багаты гістарычны вопыт, што нас аб'ядноўвае.

Па каментарый аб выніках правядзення форуму мы звярнуліся і да **вядомага расійскага журналіста, доктара гістарычных навук Аляксандра ЧАРНЯКА.**

— Прыемна, што беларусы вельмі паважліва ставяцца да памяці пра Вялікую Айчынную вайну. Убачылі мы гэта і на Дзяржыншчыне, на Міншчыне, звязанай з імёнамі славутых партызанскіх злучэнняў, — адзначыў ён.

Усе ўдзельнікі форуму былі адзінадушнымі ў тым, што на свае вочы ўбачылі прыклад, варты пераймання дзеля патрыятычнага і экалагічнага выхавання моладзі. Як зазначалі многія ўдзельнікі прэс-канферэнцыі ў цэнтры «Станькава», гэты прыклад стаў магчымым дзякуючы клопату мясцовага агракамбіната «Дзяржынскі». Удзельнікі эксперт-сесіі даведаліся пра справы яго працаўнікоў і пацікавіліся іх планамі на будучыню.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**



**Пад дубам-волатам імкнуўся пастаяць кожны.**

■ Запрашальнік

# У ГОСЦІ ДА РАДЗІМІЧАЎ

## ПАД ТАКОЙ НАЗВАЙ У СУБОТУ АДБУДЗЕЦЦА СТАРАДАЎНЯЕ СВЯТА Ў ЧАВУСКІМ РАЁНЕ

**Мерапрыемствы пройдуць у аграгарадку Радамля, які мае багатую гісторыю.**

Існуе легенда, што менавіта адсюль пачалося засяленне міжрэчча Дзясны і Дняпра плямёнамі радзімічаў. Наведвальнікаў чакае вялікі стылізаваны кірмаш, дзе майстры і рамеснікі будуць прадаваць свае вырабы і праводзіць майстар-класы. Цікавінкай стане кулінарнае свята, на якім жыхары Радамлі пазнаёмяць са стравамі мясцовай кухні. А галоўнае, будзе магчымасць паглядзець захапляльнае тэатралізаванае прадстаўленне. Рэканструкцыя падзей XI—XII стагоддзяў адбудзецца на пляцоўцы перад старажытным гарадзішчам, адкуль адкрываецца маляўнічы від на Замкавую гару. Для гэтага відовішча нават пашылі традыцыйныя касцюмы радзімічаў па эскізах, узгодненых з экспертамі. А мясцовы майстар зрабіў металічныя ўпрыгажэнні, у якіх фарсілі тагачасныя модніцы. Цікава, што, калі капалі зямлянку (гэта тыповае жытло радзімічаў), навукоўцы з Мінска і Магілёва знайшлі пад культурным пластом зямлі цагляную печку XVII стагоддзя. Яе таксама можна будзе пабачыць падчас свята, запэўніла **спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Чавускага райвыканкама Юлія ГАРАНІНАВА.**

Акрамя гэтага, у раёне распрацаваны турыстычны маршрут і ўсталяваны спецыяльныя стэнды і ўказальнікі — па іх можна адшукаць дарогу да ўнікальнага 24-тоннага валуна «Кравец», старога дуба (пад якім, згодна з мясцовай легендай, нават у нашы часы з'яўляецца багіня радзімічаў — Мара), да крынічкі, вядомай яшчэ з XVII стагоддзя.

Застаецца дадаць, што свята праводзіцца па праекце «Радамля: актыўнасць для адраджэння» (у рамках праекта «Жывая гісторыя майго краю»), які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і Інстытутам міжнароднага супрацоўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў (DVV International).

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## БЕЛАРУСКУЮ ПЕНСІЮ МОЖНА БУДЗЕ АТРЫМЛІВАЦЬ І Ў АЗЕРБАЙДЖАНЕ

**Учора ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі было ратыфікавана пагадненне паміж урадамі Беларусі і Азербайджана аб супрацоўніцтве ў галіне пенсійнага забеспячэння.**

Дзякуючы гэтаму кроку Беларусь і Азербайджан будуць прызначаць і выплачваць пенсію за стаж працы, набыты на сваёй тэрыторыі. Калі пенсіянер вырашыць перасяліцца з Беларусі ў Азербайджан ці наадварот, дзяржава, дзе ён працаваў, працягне выплату пенсіі. Што тычыцца перыяду працы (стажу) да 1 студзеня 1992 (падчас існавання Савецкага Саюза), то ў гэтым выпадку пенсійнае забеспячэнне бярэ на сябе краіна пражывання пенсіянера.

У пагадненні таксама прапісана, што грамадзяне выплачваюць абавязковыя страхавыя ўзносы на пенсійнае забеспячэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы, на тэрыторыі якой яны працуюць. Выключэнне складаюць некаторыя сітуацыі, пазначаныя ў пагадненні.

**Святлана БУСЬКО.**

## ЛЕДЗЯНЫЯ КУРГАНЫ ПАД ІВАНАВАМ

Такой велічыні граду раней не бачылі ў Іванаўскім раёне. Ён абрынуўся на палі ААТ «Баравіца», іншых гаспадарак, спляжыў пасевы і агароды вяскоўцаў. Навальніца наляцела ўвечары, і літаральна за чвэрць гадзіны градабой зраўняў з зямлёй пасевы на трохстах гектарах і значна пашкодзіў збожжавыя, зернебабовыя, кукурузу, а таксама бульбу, буракі на плошчы больш за 750 гектараў.

Падлічваюць страты таксама аграрыі «Зара-Агра», «Кастрычнік-Агра» «Агра-Днепрабуг», «Бродніцы». Уся паўднёвая частка Іванаўскага раёна пацярпела ад стыхіі 6 чэрвеня. Вяскоўцы страцілі агароды. Бульбу ўшчэнт пабіла градам, прапалі цыбуля і морква. У каго былі поліэтыленавыя цяпліцы, градзіны ператварылі іх амаль у рэшата, а на адным з дамоў вёскі Пераруб нават пабіла сайдынг. У лесе назаўтра відавочцы заўважылі збітыя галіны дрэў. Пакрытыя белым градам, яны выглядалі, як ледзяныя курганы.

**Яна СВЕТАВА.**

## ГУМАВАЯ ПЛІТКА

**У Бабруйску запрацавала лінія па вытворчасці больш дасканалага падлогавага пакрыцця.**

Запуск лініі па вытворчасці пліткі з гумавай крошкі адбыўся на ААТ «Шынарамонт».

— Праект распрацаваны ў рамках правядзення мерапрыемстваў па мадэрнізацыі, — распавёў **дырэктар ААТ Віктар ДЗЯСЯТНІК.** — Гэты матэрыял мае куды больш доўгі перыяд эксплуатацыі ў параўнанні з іншымі падлогавымі пакрыццямі, а яго выкарыстанне накіравана, у тым ліку, на паляпшэнне экалагічнай сітуацыі нашага рэгіёна.

Плітка «Эковер-Пол» выпрацоўваецца па ўнікальнай тэхналогіі прэсавання фракцыйнай гумавай крошкі, атрыманай шляхам перапрацоўкі зношаных шын, з дапаўненнем універсальнага поліўрэтанавага сувязнага і каляровага пігменту.

Спецыялісты сведчаць, што гумавае пакрыццё менш псуецца пры транспартаванні і ад уздзеяння сонечных промняў, яно больш траўмабяспечнае і зносаўстойлівае. Плітку з гумавай крошкі плануецца выкарыстоўваць на дзіцячых і спартыўных пляцоўках, іншых сацыяльных і вытворчых аб'ектах.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## «АМАТАР» ВЕЛАСІПЕДАЎ?

**За пяць месяцаў у Партызанскім раёне сталіцы было зарэгістравана 28 крадзяжоў веласіпедаў. Агульная сума шкоды склала каля 110 мільёнаў рублёў.**

Як распавяла прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Ганна Чыж-Літаш, у апошнім выпадку малады чалавек патрапіў у пад'езд дома па вуліцы Бядулі і ўкраў дарагую двухколавую машыну. Транспартны сродак быў «прышпілены» да лесвічных парэнчаў, аднак зламысніка гэта не спыніла: ён «перакусіў» замок спецыяльным інструментам.

— Гэты гаспадар хацеў б паспрабаваў абараніць сваю маёмасць, — кажа суразмоўца. — А практычна ва ўсіх папярэдніх выпадках веласіпеды папросту знаходзіліся ў пад'ездзе без нагляду. Месцы крадзяжоў не паўтараліся. У аператыўнікаў ёсць падставы меркаваць, што шэраг злачынстваў мог быць здзейснены адным і тым жа чалавекам.

## НА ДЗЯРЖІНСПЕКТАРАЎ — З НАЖОМ

**Каля 13 мільёнаў рублёў штрафу выплаціць браканьер з Магілёва, які пагражаў дзяржінспектарам нажом падчас затрымання на вадаёме каля вёскі Каліновая.**

— Парушальніка з восцямі супрацоўнікі Магілёўскай міжрайінспекцыі заўважылі з процілеглага берага. Аднак пакуль аб'язджалі вадаём, той паспеў схаваць забароненую прыладу лоўлі ў траве. Знайсці яе аказалася нескладана. Відавочна, гэта і раззлавала браканьера, — распавяла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Пры затрыманні мужчына паводзіў сябе агрэсіўна: дастаў з кішэні сцізорык і стаў у пагрозлівую позу. За пагрозу гвалтам у дачыненні да службовай асобы была заведзена крымінальная справа. Суд прызначыў магіляўчаніну пакаранне ў выглядзе штрафу — 60 базавых велічынь. Яшчэ 25 базавых велічынь яму давядзецца заплаціць за парушэнне правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПАТАНЦАВАЦЬ У ГРОДНЕ!

**Заўтра, 14 чэрвеня, усе жыхары і госці сёлетняй культурнай сталіцы Беларусі змогуць патанцаваць на вуліцы і плошчы Савецкай у рамках акцыі «Танцуючы Гродна», якую ладзіць маладзёжны праект «Жывая гісторыя».**

З 18 да 21 гадзіны на пешаходнай вуліцы і плошчы чакаюць усіх аматараў танца незалежна ад узросту. Для дзяцей будуць арганізаваны спецыяльныя пляцоўкі. Спачатку адбудуцца майстар-класы па навучанні ўсіх ахвотных розным танцавальным кірункам, гала-канцэрт танцавальных калектываў. А затым — флэшмоб, калі ўсе ўдзельнікі выканаюць той ці іншы танец. Яго рухі, дарэчы, можна запомніць і самастойна, зазірнуўшы на інтэрнэт-старонку акцыі: http://vk.com/dancegrodno.

— Давайце зробім наш горад самым танцуючым! — запрашае кіраўнік праекта «Жывая гісторыя» Сяргей Іваноў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

■ Пагляд

Беларусь — ЕС:

# БУДУЧЫНЯ ЗА РАЎНАПРАЎНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВАМ



**Апошнім часам былі значна інтэнсіфікаваны кантакты айчыннай дыпламатыі з краінамі Еўрапейскага саюза. Толькі з пачатку чэрвеня беларускае МЗС паўдзельнічала ў пасяджэнні Савета міністраў замежных спраў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы ў Вене, прайшлі беларуска-польскія і беларуска-фінляндскія палітычныя кансультацыі, адбыліся перамовы нашага боку з МЗС Аўстрыі, а таксама візіт дэлегацыі міністэрства эканомікі Славацкай Рэспублікі ў Мінск.**

### ПРАГМАТЫКІ ЗМЯНЯЮЦЬ «ЯСТРАБАЎ»?

5–6-га чэрвеня эстафету па развіцці супрацоўніцтва Беларусі і ЕС падхапіла акадэмічная супольнасць. У сценах старэйшай айчыннай alma mater прайшла міжнародная канферэнцыя «Еўрапейскі саюз і Рэспубліка Беларусь: перспектывы супрацоўніцтва», арганізаваная Беларускім дзяржаўным універсітэтам пры падтрымцы прадстаўніцтва ЕС у Беларусі.

Гэткая актывізацыя стасункаў сведчыць не толькі пра ажыўленне палітычнага дыялогу, але таксама і пра тое, што **пазіцыі «ястрабаў» у еўрапейскім істэблішменце ў дачыненні да Беларусі паступова замяшчаюцца меркаваннем прагматыкаў,** якім добра зразумела (асабліва на фоне ўкраінскага крызісу), што наша краіна, нягледзячы на неадпаведнасць айчыннай мадэлі грамадства жаданням Еўрасаюза, з'яўляецца прадказальным і надзейным партнёрам, з якім трэба выстройваць канструктыўныя ўзаемавыгадныя адносіны.

Палітыка ціску і прымусаў, гвалтоўнага экспарту каштоўнасцяў, дзе еўрапейскі бок з пазіцый «настаўніка» спрабаваў «выхоўваць» беларускага «вучня», на практыцы неаднаразова паказала сваю неадпаведнасць у дачыненні да нашай дзяржавы, чыя ўласная палітыка-прававая традыцыя зыходзіць яшчэ ад нормаў статутаў Вялікага Княства Літоўскага. Кансерватыўны характар беларускага соцыуму, заснаваны на старадаўнім прынцыпе «не рушыць старыны», з яго імкненнем да калектывізму, парадку і моцнай дзяржаўнай ролі доўгі час быў незразумелы еўрапейскім партнёрам, якія настойліва патрабавалі ад афіцыйнага Мінска ператварыць Беларусь у чарговае поле для ліберальных эксперыментаў.

Сёння адзначаецца некаторая тэндэнцыя да змены стаўлення краін ЕС да Беларусі. Безумоўна, пакуль рана казаць аб тым, што еўрапейскія эліты прызналі за нашай краінай і грамадствам права на ўласную мадэль, заснаваную на сваёй традыцыі дзяржаўнага будаўніцтва, але пазітыўныя сігналы з боку ЕС ужо ёсць. **Паміж Еўрапейскай службай знешніх дзеянняў і МЗС Рэспублікі Беларусь запушчаны прынцыпова новы фармат дыялогу «Часовая фаза», куды ўпершыню еўрапейскімі партнёрамі не былі ўключаны дысідэнцкія групы з Беларусі.** Гэты фармат можа стаць сапраўднай пляцоўкай узаемадзеяння, бо прадстаўлены з беларускага боку афіцыйнымі асобамі і будзе засяроджаны не на пытаннях палітыкі, распрацоўкі чарговых санкцый ці змены канстытуцыйнага ладу ў нашай краіне (на што былі скіраваны мінулыя «дыялогі» еўрачыноўнікаў ды айчыннай апазіцыі), а на практычных праблемах двухбаковага парадку дня: кааперацыі дзелавых колаў, трансгранічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі інфраструктурных праектаў.

### АДНА ЕЎРОПА — ДЗВЕ МАДЭЛІ

Цікавым з пункту гледжання аналізу настрояў у колах еўрапейскіх палітычных эліт бачыцца і каментарый кіраўніка прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Майры Моры. **Падчас вышэйзгаданай канферэнцыі ў БДУ дыпламат адзначыла не толькі «неабходнасць ведаць гісторыю краін» і ўлічваць гісторыка-культурныя фактары ў выстройванні стратэгіі знешняй палітыкі, але і цікавасць еўрапейскага боку да вопыту сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі, дзе наша краіна «вельмі хутка расце».**

Хочацца спадзявацца, што такая змена рыторыкі ад дэструктыўнай крытыкі да зацікаўленасці ў вывучэнні беларускай традыцыі і нават вопыту сацыяльна-эканамічнага развіцця заснавана на сталым рашэнні знешнепалітычнага ведамства Еўрапейскага саюза і стане адным са стрыжняў новай еўрапейскай палітыкі на беларускім напрамку.

Такі падыход будзе цалкам апраўданы, бо кіравацца ў адносінах да Беларусі прынцыпамі, якія прымяняюцца пры ацэнцы адэкватнасці краін, што прэтэндуюць на членства ў ЕС, немэтазгодна. Рэспубліка Беларусь пакуль і блізка не дэкларуе такія мэты ў якасці сваіх знешнепалітычных прыярытэтаў. Наадварот, Беларусь разам з Расійскай Федэрацыяй і Казахстанам выступіла ў якасці заснавальніка іншага інтэграцыйнага фармату — Еўразійскага эканамічнага саюза, што пачне паўнавартасна працаваць ужо з 1 студзеня 2015 года. **Па факце гэта значыць, што, будучы неад'емнай часткай Еўропы, Беларусь з'яўляецца іншым, адрозным ад Захаду, прыкладам дзяржаўнай традыцыі.**

Амерыканскі даследчык Сэмюэл Хантынгтан залічваў нашу краіну да асобнай цывілізацыі т.зв. «праваслаўнага свету», што ў ліку заходняй, ісламскай, лацінаамерыканскай ды іншых цывілізацый складаюць аснову «поліцывілізацыйнага парадку» на планеце. Пры гэтым у сваёй найбольш вядомай працы «Сутыкненне цывілізацый» вучоны адзначаў, што заходнім элітам **«вельмі важна ўсвядоміць, што ўмяшанне Захаду ў справы іншых цывілізацый з'яўляецца, бадай, адзінай крыніцай і патэнцыйнага глабальнага канфлікту ў поліцывілізацыйным свеце».** Крызісная сітуацыя ва Украіне, дзе Захад спрабаваў гуляць на іншым цывілізацыйным полі, яскрава сведчыць аб тым, наколькі меў рацыю славуты амерыканскі палітолаг.

### АГУЛЬНАЯ ПЕРСПЕКТЫВА

Магчыма, менавіта фіяска ва Украіне прымусіць еўрапейскую дыпламатыю па-іншаму паглядзець на Беларусь, дзе існуюць вялікія магчымасці для двухбаковага супрацоўніцтва. Нагадаем, што паміж бакамі адсутнічае нават паўнавартасная нарматыўная база, бо не падпісаны базавы дагавор аб партнёрстве, перамовы пра які ЕС спыніў па палітычных матывах у сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

Іншым ганебным фактам з'яўляецца спіс персанальных санкцый, што быў уведзены ўладамі ЕС у дачыненні да беларускіх чыноўнікаў, журналістаў, вучоных, бізнесменаў у 2011 годзе з падачы некаторых айчынных палітыкаў. У якіх умовах і з якім падыходам фарміраваўся гэты найбольш шырокі ў свеце спіс, што змяшчае 232 прозвішчы і прадугледжвае забарону на ўезд у краіны Еўрапейскага саюза, сведчыць хаця б той сумны кур'ёз з прымяненнем санкцый у дачыненні да беларусаў, якіх на той момант ужо не было сярод жывых. Гэтаксама цяжка патлумачыць, нават з палітычных матываў, дзеянне санкцый супраць беларускага бізнесу і прамысловасці: больш за 20 беларускіх прадпрыемстваў абмежаваны ў правах і не маюць магчымасці ажыццяўляць якасную дзейнасць на тэрыторыі Еўрапейскага саюза.

З прычыны такіх знявечаных адносін Рэспубліка Беларусь мае вельмі слабыя паказчыкі засваення грашовых сродкаў праграмы ЕС «Усходняе партнёрства», што ў перакладзе на лічбы «страчанай выгады» складае сотні мільёнаў еўра. Напрыклад, Беларусь атрымала з бюджэту праграмы нашмат менш за іншых удзельнікаў — усяго 41 млн еўра (Украіна — 470, Арменія — 157, Азербайджан — 100, Малдова — 273, Грузія — 180). **Адначасова Беларусь з'яўляецца не толькі найбольш развітай краінай з гэтага шэрагу ў эканамічным плане (згодна з даследаваннямі Сусветнага банка, больш за 80% жыхароў адносяцца да сярэдняга класа, што адпавядае паказчыку, прынятаму для Заходняй Еўропы), але і найбольш стабільнай у плане палітычным, бо адзіная не мае амаль ніякіх міжэтнічных, міжрэлігійных супярэчнасцяў, тэрытарыяльных спрэчак з суседзямі, праблем распаўсюджвання экстрэмізму і нацыяналізму.**

Відавочна, што патэнцыял беларуска-еўрапейскага супрацоўніцтва далёка не рэалізаваны. Добра, што ўжо дзейнічаюць праекты еўрапейскай тэхнічнай падтрымкі пры забеспячэнні беларуска-ўкраінскай мяжы, у транспартную карту «Усходняга партнерства» ўключаны беларуска-літоўскія прапановы па арганізацыі хуткаснай чыгункі паміж Мінскам і Вільнюсам, рэканструкцыі аўтамабільнай дарогі Мінск — Вільнюс і пункта пропуску «Каменны Лог». Аднак зразумела, што вобласць узаемадзеяння мусіць быць пашырана: прынятая праграма рэіндустрыялізацыі Еўропы можа ўключаць у сябе магчымасці беларускай індустрыі, што цалкам адпавядае задачам мадэрнізацыі айчыннай эканомікі, а Беларусь можа стаць добрай пляцоўкай для выхаду еўрапейскіх інвестараў на рынак Еўразійскага эканамічнага саюза. У той жа час, нягледзячы на прывабнасць еўрапейскіх тэхналагічных і фінансава-крэдытных магчымасцяў, такая кааперацыя магчымая толькі на раўнапраўнай аснове.

У інтэрв'ю сербскім сродкам масавай інфармацыі беларускі Прэзідэнт адзначыў, што ніколі не дазволіць «Захаду адчуваць сябе гаспадаром на Беларусі». Відавочна, што лінія беларускага боку, скіраваная на абарону нацыянальных інтарэсаў, застаецца нязменнай на працягу ўсёй найноўшай гісторыі нашай Бацькаўшчыны, і як бы такая ўпартасць параўнальна невялікай краіны не бянтэжыла 500-мільённы Еўрапейскі саюз, з беларускімі інтарэсамі мэтазгодна прымірыцца і працаваць, наколькі гэта магчыма і выгадна для абодвух бакоў.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ**

■

УНП 600068480

**Уважаемые акционеры ОАО «Рапс»**
24 июня 2014 года состоится
**внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Рапс»,**
расположенного по адресу:
Минская обл., Минский район, 223014, аг. Крупица.

**Собрание пройдет по адресу:** Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул. Садовая, д. 20, Административное здание ОАО «Рапс», первый этаж, актовый зал.

**Повестка дня собрания:**
1. О расторжении договора ипотеки № 290 от 01 августа 2012 года.
2. О заключении договора ипотеки в обеспечение исполнения обязательств по кредитному договору № 289 от 01 августа 2012 года.
3. О совершении крупной сделки с ОАО «Белагропромбанк».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: Минская обл., Минский район, аг. Крупица, ул.Садовая, 20, ОАО «Рапс» (бухгалтерия) с 16 июня по 23 июня 2014 года (время работы с 14.00 до 16.00) либо 24 июня 2014 г. по месту проведения собрания.

**Регистрация участников собрания** с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания –** 24 июня 2014 г., в 11.00.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 18 июня 2014 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**
*акционеру общества* – паспорт, *представителю акционера* – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке!

**Справки по тел. 8 (017) 5069211, 8 (017) 5069341.**

Таццяна ЯКУШАВА:

# «ЯКАСНАЯ МУЗЫКА — ГЭТА ТОЕ, ШТО ЗРОБЛЕНА З ДУШОЙ»

TV@R

**Яна ведае пра музыку вельмі шмат і з цікавасцю назірае за ўсім, што адбываецца ў гэтай сферы, чэрпаючы ў мелодыях энергію для жыцця. Аддае перавагу сімфанічнай музыцы і рок-баладам, рамансам, джазу. Ёй да душы, калі жыццё не залежыць ад распарадку, ёй падабаюцца кнігі, кіно, падарожжы на аўтамабілі, старадаўняя архітэктура. Бо ў гэтым ва ўсім творчая асоба здольна пачуць сваю непаўторную музыку. Пра фарміраванне музычнага густу, ролю індывідуальнасці і мары пра вялікую сцэну кіраўнік музычнага вяшчання Беларускага радыё Таццяна Якушава расказала «Звяздзе» па-за эфірам.**



Фота Аксаны МАНЧУК.

***— У адным інтэрв'ю вы сказалі: «Нават у смелых марах я не магла ўявіць, што буду працаваць на радыё». У якой прафесіі бачылі сябе?***

— Так, у юнацтве да мяне не тое што мары, але нават думкі такія не прыходзілі, хоць журналістыка вабіла заўсёды. Праўда, яна мне здавалася недасяжнай, нават элітарнай прафесіяй, дзе патрэбна не толькі жаданне, але найперш прызванне. А паколькі ў дзяцінстве даволі складана разабрацца ў сваіх захапленнях, то і журналістыка засталася на ўзроўні аднаго са шматлікіх жаданняў. Я вучылася не толькі ў звычайнай школе, але і музычнай, дзе мне ўсё падабалася і лёгка давалася. Гэта і паўплывала на выбар прафесіі, які падтрымала мама. Я паступіла ў музычнае вучылішча, потым у кансерваторыю, пасля гэтага пэўны час выкладала ў Маладзечанскім музычным вучылішчы, Мінскім каледжы мастацтваў, пакуль яго вялікасць выпадак не павярнуў маё жыццё ў іншы бок. Шчыра кажучы, я не шкадую. Бо дзякуючы гэтаму ўвасобіла тое, да чаго інтуітыўна імкнулася ў дзяцінстве — стала музычным журналістам.

***— І як апынуліся на радыё?***

— У многім дзякуючы кампазітару Дзмітрыю Далгалёву, які ў свой час працаваў там. Ён ведаў, што кіраўніцтва шукае музычнага рэдактара, і прапанаваў маю кандыдатуру. Безумоўна, я хвалявалася і не адразу адважылася на такі смелы крок. Выпрабавальны тэрмін, падчас якога я сама пераканалася ў правільнасці рашэння, доўжыўся не больш за месяц, і ў маі 1996 года я пачала працаваць у штаце музычнай рэдакцыі Беларускага радыё.

***— Маглі б прыгадаць самыя яркія і важныя сустрэчы, якія падарыла вам праца на радыё?***

— Не хацелася б штосьці асобна вылучаць, бо кожная сустрэча па-свойму на мяне паўплывала і пакінула след у душы. У гэтым і чароўнасць прафесіі — сустракацца з абсалютна рознымі людзьмі, бачыць іх не толькі на сцэне, але і ў іншых абставінах. Здараецца, такія сустрэчы і прыемна здзіўляюць, і расчароўваюць. На сваім вопыце магу пацвердзіць — чым больш таленавіты чалавек, чым больш ён дасягнуў у сваёй прафесіі, тым больш уважліва ён ставіцца да іншых. Магчыма, таму, што выдатна ведае цану сапраўднага поспеху. Напрыклад, вядомы музыкант, дырыжор Уладзімір Федасееў, які за дырыжорскім пультам волат, чалавек магутнай волі, падчас размовы аказаўся сціплым, мяккім, далікатным. Праўда, гэта ў асноўным датычыцца прадстаўнікоў акадэмічных жанраў, бо сярод эстрадных артыстаў славалюбства і вера ва ўласную дасканаласць — даволі распаўсюджаныя з'явы. Нездарма шоу-бізнес называюць «кірмашом пыхлівасці». Чамусьці еўрапейскія «зоркі» сцэны больш даступныя і простыя ў зносінах, чым расійскія. Адрозніваюцца ў паводзінах і прадстаўнікі маладога і старэйшага пакаленняў. У любым выпадку, якія ўражанні не пакідалі б такія сустрэчы, я іх аднолькава цаню, бо гэта вельмі каштоўны досвед.

***— Калі вы пачыналі працаваць на радыё, то вашым крытыкам была мама. А цяпер да чыіх меркаванняў такога кшталту прыслухоўваецеся?***

— Да ўсіх. Абсалютна нармальна стаўлюся да крытыкі. Мае перадачы часта слухае муж, якога я нават спецыяльна прашу рабіць заўвагі. Думка зацікаўленага чалавека, які шчыра называе недахопы, дапамагае аб'ектыўна паглядзець на сябе.

***— Ведаю, быў перыяд, калі вы выкладалі. А не даводзілася лавіць сябе на думцы: «Я магла б апынуцца на вялікай сцэне»?***

— Мне думаецца, што такія амбіцыі больш уласцівыя сучаснай моладзі. У мой час трапіць на вялікую сцэну было намнога складаней. Неабходна было не толькі жаданне, але і ўпэўненасць, што гэта сапраўды прызванне, што без сцэны жыццё — не жыццё. Гэта цяпер, дзякуючы ў тым ліку і шматлікім кастынгам маладым людзям здаецца, што стаць «зоркай» вельмі лёгка і проста. Але пра тое, што гэта прывідны поспех, сведчыць хуткая змена так званых «зорачак» на эстрадным небасхіле. Я марыла не пра кар'еру артысткі, а пра далёкія вандроўкі. У юнацтве маімі настольнымі кнігамі былі «Галінка сакуры» і «Карані дуба» вядомага журналіста-міжнародніка Усевалада Аўчыннікава, а таксама яго нарысы пра розныя краіны свету. Таму можна лічыць, што падсвядома ў мяне было жаданне займацца міжнароднай журналістыкай.

***— Якую ролю адыгрывае музыка ў вашым жыцці?***

— Музыка са мной заўсёды. Я часта наведваю канцэрты, спектаклі, стараюся не прапускаць значных культурных падзей. Хаця з часам, на жаль, гэта стала для мяне ўжо не святам, а работай, нават тады, калі я іду на той ці іншы канцэрт проста для душы. Прызнаюся, калі-нікалі ўспамінаецца прымаўка «лепшая музыка — гэта цішыня».

**Варта прызнаць, што маладыя эстрадныя выканаўцы часта імкнуцца быць падобнымі на замежных «зорак». На жаль, яны не разумеюць, што такім чынам губляюць сябе.**

***— Музычны густ дзіцяці фарміруецца бацькамі альбо яго ўласнымі інтарэсамі?***

— Лічу, што бацькі адыгрываюць асноўную ролю ў выхаванні ў тым ліку і музычнага густу. Безумоўна, маладыя людзі праходзяць праз узроставыя захапленні, інтарэсы, але стрыжань, закладзены ў дзяцінстве, застаецца. Асабіста на мяне вялікі ўплыў аказала музыка, якую слухала маці. У яе была калекцыя пласцінак, але часцей за ўсё ў доме гучалі вальсы Штрауса.

***— Якія ўражанні пакідае праца над праектам «Маладыя таленты Беларусі»?***

— Праект патрабуе шмат часу, сіл, увагі, але прыносіць сапраўдную радасць, асабліва падчас конкурсных праслухоўванняў, калі Дом радыё напаўняецца дзіцячымі галасамі. Гэта як подых свежага ветру, водар стракатага лета, вясёлка пасля дажджу. Уражвае адданасць творчасці, шчырасць, бязмежная любоў да музыкі, адказнасць, з якой рыхтуюцца канкурсанты. Усё гэта выклікае жаданне падтрымаць маладых у іх пошуках і дае сілы працаваць далей.

***— Якія перспектывы адкрывае гэты конкурс?***

— Лічу, што перспектывы кожнага чалавека залежаць у першую чаргу ад яго самога. А наш конкурс дае шанц маладым людзям паказаць свой талент і майстэрства не толькі перад журы, але і заявіць пра сябе ў радыёэфіры, куды трапляюць усе, хто праходзіць у другі і трэці туры. Больш за тое, пераможцы атрымліваюць права на актыўную ратацыю, што адпаведна спрыяе адкрыццю новых перспектыў. Мяркую, што для пачаткоўцаў гэта самая важная ўзнагарода.

***— Ці адсочваеце вы далейшы лёс лаўрэатаў? Можа, неяк садзейнічаеце іх прафесійнаму станаўленню?***

— Безумоўна, мы сочым за іх лёсамі, радуемся поспехам, расказваем у эфіры пра новыя перамогі. Мне прыемна, што па выніках мінулага года шэсць нашых лаўрэатаў адзначаны стыпендыямі і прэміямі Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Безумоўна, гэта сур'ёзны стымул для далейшага развіцця і прафесійнага станаўлення. Некаторыя першыя пераможцы конкурсу ўжо ярка заявілі пра сябе ў прафесіі. Напрыклад, Алена Ланская паспяхова працуе на эстрадзе, Уладзімір Дзмітрук з нядаўняга часу саліст Акадэміі Пласіда Дамінга пры Лос-Анжэлескай оперы, Улада Беражная працягвае ўдасканальваць сваё майстэрства ігры на скрыпцы ў Германіі, вядзе актыўную канцэртную дзейнасць. І гэта толькі некалькі прыкладаў удалай кар'еры, да якой мае дачыненне і наш конкурс.

***— Чаго, на вашу думку, не хапае сёння маладым артыстам?***

— Галоўнае ў музыцы, як і ў любым мастацтве, незалежна ад жанру — індывідуальнасць. Але ў поўнай меры яна раскрываецца з часам. Безумоўна, на гэта ўплывае асяроддзе, а таксама жаданне заставацца самім сабой. Варта прызнаць, што маладыя эстрадныя выканаўцы часта імкнуцца быць падобнымі на замежных «зорак». На жаль, яны не разумеюць, што такім чынам губляюць сябе.Таму адна з абавязковых умоў нашага конкурсу — выкананне твора беларускага кампазітара і беларускамоўнай песні. Мы лічым, што нацыянальная аснова — лепшы спосаб для раскрыцця індывідуальнасці. Усім маладым я параіла б не толькі вучыцца на прыкладах вядомых асоб, але і ўважліва слухаць сябе, каб на вопыце іншых знайсці сваё месца ў музычнай прасторы.

***— Калі браць дзіцячы конкурс «Еўрабачанне», то нашы дзеці часта ў лідарах. Чаму так не заўсёды адбываецца з дарослымі канкурсантамі?***

— Я часта сама сабе задаю гэтае пытанне. Думаю, справа ў тым, што ўсе дзеці непасрэдныя, яны нічога не разыгрываюць, яны такія, якія ёсць. Але з часам усё складаней не паддавацца нейкім уплывам, модзе, што і вядзе да страты індывідуальнасці.

***— Пытанне прафесіяналізму сёння яшчэ застаецца актуальным для беларускай эстрады?***

— Пытанне прафесіяналізму актуальнае заўсёды, гэтак жа, як і пытанне прафесійнай адукацыі. Некаторыя эстрадныя артысты ганарацца тым, што не ведаюць нот. З аднаго боку, цудоўна, што прырода падарыла ім добры музыкальны слых і густ. Але ж гэта толькі вяршыня айсберга. Прафесійная адукацыя, апроч неабходных ведаў, дае магчымасць працаваць над сабой, шукаць творчыя ідэі, бачыць і раскрываць свой патэнцыял. Усе вялікія музыканты, нават славутыя самавукі, спасцігалі таямніцы прафесіі не толькі на ўласным выканальніцкім вопыце.

***— Што ж для вас з'яўляецца паказчыкам якаснай музыкі?***

— З аднаго боку, гэта час, які пакідае ў нашых сэрцах толькі самае лепшае і вартае ўвагі, з другога — усё, што зроблена з душой, напоўнена энергіяй, якую немагчыма растлумачыць, але лёгка адчуць.

**Алена ДРАПКО**

■ Неасабісты суб'ектыў

# УЛАСНАЯ СПРАВА



**Горкая праўда аб мінулай вайне сёння нікому, акрамя нас, асабліва і не патрэбна. Нам яе і захоўваць**

На мінулым тыдні ў французскай Нармандыі шырока адзначалася 70-годдзе высадкі саюзніцкіх войскаў: па сутнасці, юбілей адкрыцця другога фронту. Пра яго ролю ў гісторыі сказана нямала, ён хоць і не прадвызначыў зыход той страшнай вайны (савецкія войскі ўжо вызвалялі Беларусь і наўрад ці спыніліся б у сваім пераможным паходзе на Берлін), але дазволіў зберагчы тысячы жыццяў нашых салдат і мірных жыхароў. Гэта неаспрэчны факт, і падзея, што адбылася 70 гадоў назад на суровым беразе Атлантыкі, вартая ўвагі, святкавання і памяці.

Але ведаеце, што ў тым святкаванні, рэпартажы з якога круглыя суткі круцілі еўрапейскія каналы, найбольш уразіла? Не толькі пампезнасць — нібыта высадка ў Нармандыі была самай значнай падзеяй Другой сусветнай і нібы не было Курскай бітвы, Сталінграда, масавага супраціўлення на беларускіх землях. (Пра гэтую самую неабгрунтаваную пампезнасць доказна і вобразна гаварыў нядаўна ў інтэрв'ю сербскім журналістам наш Прэзідэнт.) Больш мяне ўразілі ўспаміны старых французаў, тых, якія былі на акупаванай фашыстамі тэрыторыі і першымі сустракалі саюзніцкі дэсант. З лёгкімі ўсмешкамі на тварах гэтыя людзі расказвалі, як цяжка ім даводзілася пры фашыстах: было мала прадуктаў, часам уводзілася каменданцкая гадзіна. А калі прыйшлі саюзнікі, колькі турбот было: спачатку вывесілі іх сцягі, спявалі і танцавалі, а потым прайшла чутка, што немцы перайшлі ў наступленне. Давялося сцягі хуценька здымаць, музыку выключаць. А пазней, калі немцаў пагналі канчаткова і беспаваротна, зноў сцягі павесілі, музыку ўключылі, сталі танцаваць і спяваць...

І пра ўсё гэта — спакойна і амаль весела. Спачатку падумалася: можа, у іх, задаволеных жыццём, сытых еўрапейцаў, успрыняцце нават самых трагічных падзей проста зусім іншае, чым у нас, эмацыянальных уражлівых славян, якія ўсё не розумам — сэрцам успрымаюць? Згадала бабуль з роднай вёскі, равесніц тых жыццярадасных нармандцаў. Яны пра вайну ўспамінаюць не з усмешкамі — са слязамі. Зрэшты, тут не ў нашай эмацыйнасці справа. Проста ўспаміны іншыя. Пра спаленае разам з людзьмі суседняе Скірмантава. Пра вялізную магілу для койданаўскіх яўрэяў, капаць якую ганялі сялян з навакольных вёсак. Пра тое, як у цяплушках везлі ў нямецкае рабства, як там здзекаваліся гаспадары, як есці даводзілася з аднаго карыта са свіннямі. Пра тое, як палілі вёску, як стралялі дзеля пацехі ў спіны кабетам, якім спачатку «дазволілі» вынесці з падпаленых хат хоць які скарб. Пра тое, як, знайшоўшы ў суседняй вёсцы параненага партызана, вырашылі пакараць месцічаў: сабралі на плошчы ўсіх і падзялілі па прынцыпе дзіцячай лічылкі. Тых, хто аказаўся на адным баку, адпусцілі. Тых, хто на другім, — расстралялі і спалілі ў гумне...

Падобныя ўспаміны на гэтай зямлі — у кожнай вёсцы, у кожнай сям'і. І яны ніколі не будуць аднолькавымі з успамінамі тых, хто радасна сустракаў саюзніцкі дэсант, з памяццю іх нашчадкаў. Вайна была адна, але яна для нас была розная. Фашысты літавалі сваю заходнюю цывілізацыю, яны яе меркавалі захаваць, падпарадкаваўшы сабе. Каб не траўмаваць «братоў па культуры», яны не арганізоўвалі там фабрык смерці — знішчаць яўрэяў і нязгодных з рэжымам яны везлі ў Асвенцым, Трэблінку, Трасцянец — на славянскія землі. Бо славян не варта было шкадаваць, бо ім таксама ў гітлераўскіх планах было наканавана або быць знішчанымі, або ператварыцца ў рабскае быдла...

Праўда ў нас розная. Я пераканалася ў гэтым, калі павезла прыяцельку са Швейцарыі (а гэта краіна наогул у пекле той вайны была нейтральнай) у Хатынь. Па дарозе расказала ёй не толькі пра Хатынь — пра сотні беларускіх вёсак, якія былі спалены разам з жыхарамі. А зайшоўшы ў мемарыял, не магла больш вымавіць ні слова — са мной так заўсёды, калі трапляю туды: нападае нейкае здрацвенне, ногі становяцца ватнымі, чуеш толькі сэрца ў скронях ды званы, якія адлічваюць твае апошнія хвіліны, бо гэта цябе гоняць да той адрыны, штурхаючы аўтаматам у спіну... Нешта падобнае, ведаю, у Хатыні адчуваюць многія. А маёй знаёмай — хоць бы што. Яна з цікавасцю разглядала надпісы на плітах, нешта фатаграфавала, нават нейкую песеньку часам пад нос мармытала...

Як высветлілася пасля, яна так і не зразумела, дзе яна была. Ну не ўклалася ў галаву бесклапотнай еўрапейкі, што зусім недалёка ад яе краіны ёсць месца, дзе нейкіх семдзесят гадоў таму людзей палілі зажыва. Яна думала, гэта проста сімвал. І я не ведаю, ці паверыла яна мне ўрэшце, бо яе бабуля пра мінулую вайну расказвала як пра жудасна цяжкія часы, калі ў іх гарадку назіраліся перабоі... з шакаладам.

Мы часта гаворым пра тую вайну з маімі нямецкімі равеснікамі — у Германіі нямала сяброў і проста добрых знаёмых. Так, яны там адчуваюць адказнасць за той жах, які твары ўся ў Еўропе ў сярэдзіне мінулага стагоддзя. Але адказнасць гэтая... як бы лепш сказаць: неасабістая, ці што?... Спытайце сёння ў любога немца, ці ваяваў яго дзед або прадзед на ўсходнім фронце і чым ён там займаўся. Вы яшчэ як здзівіцеся! Бо большасць суразмоўцаў вам адкажа, што продак быў інтэндантам, кухарам, афіцэрам дарожных войскаў. Суцэльна мірныя спецыялісты, а нашы жорсткія партызаны іх забівалі без разбору... Сямейныя легенды зрабілі сваю справу. Яшчэ пару пакаленняў — глядзіш, і незразумела будзе, хто на каго напаў...

Таму што праўда аб той вайне — жорсткая, крывавая, страшная праўда (якую мы ведаем, бо яна — частка біяграфіі кожнага з нас) нікому, уласна, акрамя нас, не патрэбна. І чакаць, што хтосьці нас падтрымае і дапаможа яе захаваць і расказаць, паверце, не варта.

Гэта наша асабістая памяць, наша ўласная справа і наш агульны клопат. Калі не мы — то ніхто. Менавіта так у найноўшай гісторыі ўсё і выглядае.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 16 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.20** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Паўла на пачатак Пятроўскага посту.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45** «Зорнае жыццё». «Цешча шчасцю не перашкода».
**12.10** «Мая праўда». «Мікалай Наскоў. Адзін супраць усіх».
**13.10, 15.25 Меладрама «Канапа для адзінокага мужчыны». 1-я і 2-я серыі.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**17.20** Нашы.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45** Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дак. цыкл «Выпрабаванне». «Юныя мсціўцы».
**22.15 Серыял «Чорныя кошкі».**
**0.05** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.55** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.05, 23.55** Тэлебарометр.
**9.05, 17.20 Серыял «Адзін цень на дваіх».**
**10.40 Серыял «Разведка».**
**11.45 Фільм-казка «Жывая вада».**
**13.15** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**13.50 Камедыя «Капітан Крук».**
**16.25, 1.00** Ток-шоу «Перазагрузка».
**18.20** Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**18.50** Футбол. Чэмпіянат свету. Германія — Партугалія.
**20.55** Час футбола. Рыа-2014.
**21.45** КЕНО.
**21.50** Футбол. Чэмпіянат свету. Іран — Нігерыя.
**0.00 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.30, 15.00, 17.00, 21.05, 0.25** «Калейдаскоп».
**8.10, 13.40, 15.10, 17.10, 0.35** «Сімвалы эпохі». Рускія сезоны на Захадзе.
**8.25** Дзіцячы фільм. «Пасля дожджычка ў чацвер».
**9.35, 22.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.05, 21.15 «Ідыёт». Маст. фільм.**
**10.55, 23.55** «Свята далёкай зоркі». Памяці рэжысёра Валерыя Маслюка.
**11.25, 16.30, 18.40** «Размаўляем па-беларуску».
**11.30** XIV Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2014». Конкурс маладых выканаўцаў.
**13.50** «Скарбніца Магілёўшчыны». Беларускі Ватыкан.
**14.20** «Палескі пачастунак». Закалота.
**14.35** «Фабрыка цудаў». «Ролі агучваюць...». Дак. фільм.
**15.25** «Уладзімір Арсеньеў. Капітан тайгі». Дак. фільм.
**16.15** «Наша спадчына». Пахавальня ў Суботніках.
**16.35** «Беларускі народны каляндар». Масленіца.
**17.20** «Мікалай Пінігін. Мяне няма». Дак. фільм.
**18.00** «Горад Боны і Давыда». Дак. фільм.
**18.10** «Полета вольное упорство...». Дак. фільм.
**18.45** «У цэнтры Еўропы». Дак. фільм.
**19.05** «Карані». Залатое кола школ.
**19.30 «Капітан Нэма». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**22.35 «Свінарка і пастух». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**6.50** Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**7.20** Футбол. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Эквадор.
**9.15** Футбол. Чэмпіянат свету. Францыя — Гандурас.
**11.05** Футбол. Чэмпіянат свету. Аргенціна — Боснія і Герцагавіна.
**13.00—18.55, 20.55** Тэніс. Турнір ВТА. Істбарн.
**18.55** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «ФК Слуцк».
**23.00** Футбол. Чэмпіянат свету. Германія — Партугалія.
**0.55, 4.55** Футбол. Чэмпіянат свету. Гана — ЗША.
**3.00** Футбол. Чэмпіянат свету. Іран — Нігерыя.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.10, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Час абедаць!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Смешнае і яшчэ смяшнейшае».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Францыск Скарына. Лёс асветніка».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** «Вайна машын».
**22.40 Маст. фільм «Рамэа + Джульета».**
**0.50** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40** «Такі лёс».
**12.30** «Чатыры вяселлі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Далёкія сваякі».
**14.45** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.45** «Іншая краіна». «Бераг Чорнай Гары».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Мае цудоўныя...».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Мішэль Вальян: прага хуткасці».**
**22.15** «Глядзець усім!».
**23.00** «Ваенная тайна».
**0.20 Серыял «NEXT 3».**

### МІР

**5.00** «180 хвілін на сняданак».
**8.15 Маст. фільм «Спадарожнага ветру, «Сіняя птушка».**
**9.40 Маст. фільм «Вершнік без галавы».**
**11.30, 0.20** «Агульны інтарэс».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20** Серыял «Служба даверу».
**14.05** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Прыставы».**
**18.20 Серыял «Група «Зэта».**
**21.20 Маст. фільм «Не можа быць!».**
**23.00** «Беларусь сёння».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.50** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Калі пачнецца заражэнне». Фільм 1-ы.
**15.30** «Сялянская гісторыя». Фільм 1-ы.
**16.10** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**21.00 Серыял «Бомба».**
**23.45** «Асобы аддзел. Контрразведка».
**0.35 Серыял «Аддзел С.С.С.Р.».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45** Новыя рускія сенсацыі.
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**12.00, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**20.00 Серыял «Шэф-2».**
**21.40 Серыял «Пляж».**
**23.25** Сёння. Вынікі.
**23.55 Серыял «Таптуны».**

### 8 КАНАЛ

***7.00—16.00 Прафілактыка эфірнага абсталявання.***
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадавалец».
**17.00 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**17.55 Серыял «Рэванш».**
**18.45** «Кінаблакнот».
**19.00, 20.00, 23.50** «Надвор'е».
**19.05 Серыял «Добрая жонка».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Місія невыканальная-3».**
**23.10 Серыял «Да смерці прыгожая».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY".
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 18.10, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00 Серыял «Сваццця».**
**12.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**13.00** «Кіно ў дэталях».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Камедыя «Мы — легенды».**
**18.30, 0.30** «Лаві момант».
**19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**20.00 Серыял «Сваццці».**
**21.10 Меладрама «10 крокаў да поспеху».**
**23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.40** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 Серыял «Пэры Мэйсан».**
**11.10, 22.20, 0.25** «Сусветныя скарбы культуры».
**11.25** «Лінія жыцця». Максім Суханаў.
**12.20** Дак. серыял «Тэры Джонс і варвары». 1-я серыя.
**13.10 Серыял «Дзве зімы і тры леты». 1-я серыя.**
**14.10** Дак. фільм «Жывая вакцына доктара Чумакова».
**14.50 Маст. фільм «Не прамахніся, Асунта!».**
**16.30** Яўген Кісін у праграме Дзмітрыя Сіткавецкага.
**17.10** «Паліглот». Хіндзі з нуля за 16 гадзін! № 12.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Дак. фільм «Ілья Глазуноў. Расійская акадэмія жывапісу, разьбярства і дойлідства».
**19.10** «Правілы жыцця».
**19.40** «Добрай ночы, малыя!».
**19.50** «Пад небам тэатра». «Сяргей Радлоў. СЭР».
**20.20** Дак. фільм «Наколькі вялікі Сусвет».
**21.15** 60 гадоў з дня нараджэння Сяргея Курэхіна. «Больш, чым каханне».
**21.55** Дак. фільм «Каты Хатыні».
**23.00** «Кінескоп». «Кінатаўр»-2014.
**23.45** Да юбілею Жанны Бічэўскай. «Пад гітару».
**1.40** Ф. Шуберт. Саната для скрыпкі і фартэпіяна.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Пад знакам задыяка. Блізняты». 1993 год.
**6.50, 11.50** «Песня-86» (Вільнюскі выпуск). 1986 год.
**7.50** «Дзе мой тэатр?». Фільм-манаграфія.
**9.00** Фільм-спектакль «Дамы і гусары». 2-я частка.
**10.20** «Магчыма ўсё». 1992 год.
**11.00** «Кінасерпанцін». 2-я частка. 1990 год.
**12.50** Фільм-спектакль «Майстар і Маргарыта». 2-я частка. 1989 год.
**14.40** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**15.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1967 год.
**16.05** «Тэлемемуары». 1991 год.
**16.35, 18.25, 0.30** Канцэрт замежнай эстрады.
**17.00** «Умелыя рукі». 1985 год.
**17.25** «Музыка ў кінафільмах Эльдара Разанава». 1-я частка. 1981 год.
**18.45 Маст. фільм «І гэта ўсё пра яго».**
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** Па старонках перадач «...Да і пасля паўночы». 1-я частка.
**23.00** «Пакуль усе дома». 1994 год.
**23.45** «Шэсць песень на біс» Лайма Вайкуле. 2-я частка. 1994 год.
**1.00 Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа № 5: «Дыназаўр». 2-я серыя.**
**3.00** «Колба часу».
**4.00** «Кінапанарама». 70 гадоў кіно». 1-я частка. 1989 год.

### EUROSPORT

**9.30, 12.45** Футбол. Бразілеманія.
**9.45, 13.00, 21.00** Веласпорт.
**10.30** Аўта- і мотаспорт.
**10.45** Аўтагонкі. Гонка «24 гадзіны Ле Мана».
**11.45** Настольны тэніс. Карэя. Фіналы.
**14.00** Тэніс. Турнір АТР. Фінал.
**15.00, 15.40, 18.40, 1.00** Тэніс. Турнір АТР.
**15.30, 18.30, 21.30, 0.30** Футбол.
**22.00** Пра рэслінг.
**23.30, 0.45** WATTS.
**23.45** Конны спорт. Скачкі.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 2.00** Серыял «Няўдачнік».
**5.30, 11.20, 16.05, 19.00, 4.40** Скетчком «Паміж намі».
**5.45** Камедыя «Мая любімая брунетка».
**7.25** Камедыя «Фараоны і Роберсаны».
**9.00** Серыял «Вар'яцтва».
**9.45** Камедыя «Вялікі бізнес».
**11.35** Камедыя «Магутныя качаняты».
**13.30, 16.20, 21.00** Серыял «Старыя перцы».
**14.30** Камедыя «Містар Піткін: Ранняя пташка».
**17.20** Камедыя «Варэнне з сакуры».
**19.20** Камедыя «Я і яго былыя».
**22.10** Камедыя «Круты таттачка».
**23.45** Камедыя «Валацуга».
**0.15** Камедыя «Каханне з акцэнтам».
**3.00** Камедыя «А як жа Боб?».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.00** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**9.40, 18.30, 3.50** Серыял «Забароненае каханне».
**10.45** «Паненка і кулінар».
**11.15** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**12.15, 17.30** Дак. серыял «Справа Астахава».
**13.15, 17.00** Дак. серыял «Простыя складанасці».
**13.45** «Жонка. Гісторыя кахання». Ніна Пушкова.
**15.10** «Сто пытанняў дарослаunion».
**16.00, 22.10** «Зорныя гісторыі».
**20.15** Серыял «Мар'ін гай».
**21.15, 5.15** Серыял «Агент».
**23.05** Маст. фільм «Адаптацыя».
**1.05** Серыял «Хадзячыя мерцвякі».
**1.50** «Асцярожна, ашуканцы!».
**2.15** «Часова даступны». Юрый Стаянаў.
**3.10** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00, 12.50** Баявік «Гісторыя рыцара».
**7.20** Фэнтэзі «Дом ля возера».
**9.10** Камедыя «Разумнікі».
**10.55, 22.45** Меладрама «Спяшайся кахаць».
**15.10** Драма «Пасажыры».
**16.55** Драма «Баец».
**19.00** Камедыя «Ну што, прыехалі?».
**20.50** Баявік «Круты і цыпачкі».
**0.55** Драма «Забароненае каханне».
**3.15** Драма «Апошняя заслона».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Сабака на сене».
**8.40** Драма «Хлапчукі».
**10.30** Камедыя «На ростанях».
**12.20** Камедыя «Жаніцьба».
**14.10** Драма «Паляванне на Вярвольфа».
**16.30** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**18.10** Фэнтэзі «Казка. Ёсць».
**20.00** Прыгоды «1812: Уланская балада».
**21.50** Камедыя «Дублёр».
**23.30** Драма «Маленькая Вера».
**2.00** Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
**4.00** Трылер «Артэфакт».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00, 12.00** Гульні розуму.
**7.00** Займальная навука.
**8.00, 13.00** Неразгаданыя тайны.
**9.00, 14.00** Дагістарычныя монстры Гітлера.
**10.00** Мегазаводы.
**11.00, 18.00** Золата Юкана.
**15.00** Апошні тыгр Суматры.
**16.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**17.00, 2.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**19.00, 0.00, 3.00** Космас.
**21.00, 1.00, 4.00** Гульня ў лікі.
**22.00** Навука будучыні.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00** Акулы аўтатаргоў з Даласа.
**7.50, 12.20, 23.00** Голыя і напалоханыя.
**8.40, 20.35** Патрабуецца зборка.
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Каралі аўкцыёнаў.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.00, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Горш быць не магло.
**17.20, 21.00, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
**19.10** Круцей не прыдумаеш.
**21.30** Паляўнічыя на склады.
**22.00** Брудныя грошы.
**22.30** Багажныя войны.
**0.00, 5.10** Залатая ліхаманка.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## ПЯТНІЦА, 20 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40 Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.20 Зона Х.
**9.10 Дэтэктыў «Забіць Сталіна».**
**11.10, 20.00 Серыял «Давай пацалуемся».**
12.10, 0.10 Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.10 Серыял «Сэрца Марыі».**
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «След».**
**16.20 Серыял «Сямейныя меладрамы».**
17.15 «Мая праўда». «Міхаіл Свецін. Смех скрозь слёзы».
18.10 «Terra incognita».
21.00 Панарама.
21.45 Нашы.
**21.55 Вестэрн «Бандыткі».**
23.55 Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 23.50 Тэлебарометр.
**9.05, 17.20 Серыял «Нож у аблоках».**
10.00 Беларуская кухня.
10.35 Стыль-бюро.
**11.10 Камедыя «Мадлен».**
12.50 «Два з паловай кухары».
**13.20 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
14.25 «Імперыя песні». Суперфінал.
15.25 Рэпарцёр.
16.20 «Кіпень».
16.40 Пад грыфам «Вядомыя».
18.20 Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
18.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Італія — Коста-Рыка.
20.55 Час футбола. Рыа-2014.
21.45 КЕНО.
21.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Францыя.
23.55 «Comedy woman».
**0.55 Камедыя «Дракула: Мёртвы і задаволены гэтым».**

### БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 13.45, 17.00, 21.05, 1.15 «Калейдаскоп».
8.10, 13.55, 17.10, 1.25 «Сімвалы эпохі». «Калінка-малінка».
8.25, 14.10, 17.20, 1.40 «Галасы з мінулага». 75 гадоў з дня нараджэння народнага артыста Беларусі, тэатральнага рэжысёра Валерыя Мікалаевіча Раеўскага.
**8.30 «Бумбараш». Маст. фільм.**
10.40, 22.05 «Нябачны фронт». Георгій Жукаў. Дак. фільм. Часткі 3-я і 4-я.
**11.05, 21.15 «Ідыёт». Маст. фільм.**
12.00, 0.50 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста СССР Мікалая Яроменкі-старэйшага.
12.25, 15.30, 18.25 «Размаўляем па-беларуску».
**12.30 «Пайсці і не вярнуцца». Маст. фільм.**
14.15 «Валерый Раеўскі. P.S.». Дак. фільм.
14.40 «Музеум». Сядзібны партрэт.
15.00 «Пісьмы з той вайны...». Дак. фільм.
15.35 «Росчырк часу». Творчасць фотамастака, мастацтвазнаўцы Алега Ананьева.
15.50 «В барабан не бью без толку...». Дак. фільм.
16.30 «Настальжы». Заслужаная артыстка Беларусі Людміла Колас.
17.30 «Скарбніца Гомельшчыны». Графскі горад, або Новае жыццё старой вёскі.
17.55 М/ф.
18.30 «Падарожжа са смакам». Дардонь.
**19.00 «Мой ласкавы і пяшчотны звер». Маст. фільм.**
20.45 Калыханка.
**22.30 «Узыходжанне». Маст. фільм.**
0.20 «АРТіШОК». Творчасць скульптара Канстанціна Селіханава.

### БЕЛАРУСЬ 5

6.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
7.20 Футбол. Чэмпіянат свету. Калумбія — Кот-д'Івуар.
9.15 Футбол. Чэмпіянат свету. Уругвай — Англія.
11.05 Футбол. Чэмпіянат свету. Японія — Грэцыя.
13.00, 16.50, 20.00—23.00 Тэніс. Турнір ВТА. Істбарн. Паўфіналы.
15.05 Фактар сілы.
15.40, 18.50 Пляжны футбол. 1-ы этап Еўралігі. Польшча — Беларусь.
23.00 Футбол. Чэмпіянат свету. Італія — Коста-Рыка.
0.55, 4.55 Футбол. Чэмпіянат свету. Гандурас — Эквадор.
3.00 Футбол. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Францыя.

### АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 Кантрольная закупка.
11.05, 13.10, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «У наш час».
12.05 «Яны і мы».
13.10 «Час абедаць!».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Адваротны адлік. «22 чэрвеня».
**16.25 Маст. фільм «Каханая жанчына механіка Гаўрылава».**
18.20 Чакай мяне. Беларусь.
18.55 «Поле цудаў».
20.00 Час.
**21.05 Серыял «Балада пра бомбера».**
**23.05 Трылер «Помста».**
1.20 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 СТБ-спорт.
9.00 «Нам і не снілася»: «Фальшывы рай».
10.05 «Аўтапанарама».
10.40, 17.30 Званая вячэра.
**11.35 Серыял «Афрамасквіч».**
12.05 «Сямейныя драмы».
13.00 «Прывітанне, доктар».
**13.50 Маст. фільм «Лязо ведзьмаў».**
15.40 «Не хлусі мне!».
16.50 «Следакі».
18.30 «Такі лёс».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Коткі супраць сабак».**
22.00, 23.00 «На тым жа месцы ў той жа час».
23.55 «Вялікая гульня». Покер-дуэль.
**0.40 Маст. фільм «Паляванне».**
2.10 «Ежа багоў».

### МІР

5.00 180 хвілін на сняданак.
**8.15 Серыял «Адну цябе кахаю».**
**10.00 Маст. фільм «Школьны вальс».**
11.35 «Сардэчна запрашаем».
12.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Шалёны анёл».**
14.05, 4.05 Дак. фільм «Тайныя знакі».
15.20 «Злачынства і пакаранне».
**16.10 Серыял «Будбацька».**
**18.20 Серыял «Рабіны гронкі пунсовыя».**
21.40 Скетч-шоу «МасГарСмех».
22.35 Ток-шоу «Яшчэ не разам».
**23.10 Маст. фільм «Табар ідзе ў неба».**
**0.50 Маст. фільм «Цешча».**
2.10 «Прыгоды Македонскай».
**2.25 Маст. фільм «Блюз ападаючага лісця».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.55 «Асаблівы выпадак».
13.50, 16.50, 19.50, 22.50 Навіны — Беларусь.
14.30 «Маршал Жукаў». Фільм 2-і.
15.30 «Геніі і ліхадзеі». Герберт Уэлс.
16.10 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
21.00 «Паядынак».
**23.00 Маст. фільм «Падары мне крышку цеплыні».**
**0.45 Маст. фільм «Крылы анёла».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
**8.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.00 «Да суда».
11.55, 13.25 «Суд прысяжных».
14.25 «Справа ўрачоў».
15.15 «Справа густу».
16.25 «Пракурорская праверка».
17.40 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**20.00 Серыял «Шэф-2».**
**23.25 Маст. фільм «Шокавая тэрапія».**

### 8 КАНАЛ

7.00, 12.30, 19.00, 20.55, 23.45 «Надвор'е».
7.05, 16.05 «Мультпарад».
**7.30 Меладрама «Пад сонцам Тасканы».**
**9.35, 17.55 Серыял «Рэванш».**
10.30 «Тэлемагазін».
**11.00 Серыял «Добрая жонка».**
**12.35 Пуаро Агаты Крысці. «Кот сярод галубоў».**
**14.25 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
**17.00 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
18.45 «Кінаблакнот».
19.05 «Героі коміксаў на экране». «Страла».
20.45 «Вечарніца».
**21.00 Дэтэктыў «Аблога».**
**23.00 Серыял «Да смерці прыгожая».**

### ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY”.
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.00, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
10.00 «Практычная магія».
**11.00 Серыял «Свацця».**
**12.00, 20.00 Серыял «Свацці».**
13.00, 23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Баявік «На скейце ад смерці».**
18.30, 0.30 «Лаві момант».
19.00 Нерэальная гісторыя.
**21.10 Трылер «Спрытныя грошы».**

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.10 Навіны культуры.
9.20 Шэдэўры старога кіно. «Наследны прынц рэспублікі».
10.45 Дак. фільм «За навуку адказвае Келдыш!».
11.25 «Правілы жыцця».
11.50 «Пісьмы з правінцыі». Козьмадзям'янск (Рэспубліка Марый Эл).
12.20 Дак. фільм «Франчэска Петрарка».
**12.25 Маст. фільм «Стары наезнік».**
14.10 Дак. фільм «Праваслаўе на Брытанскіх астравах».
14.55 Дак. фільм «Ці адны мы ў Сусвеце?». Частка 2-я.
15.35 «Царская ложа». Марыінскі тэатр.
16.15 П.І. Чайкоўскі. Канцэрт № 2 для фартэпіяна з аркестрам.
17.10 «Паліглот». Хіндзі з нуля за 16 гадзін! № 16.
18.15 Да 95-годдзя з дня нараджэння акцёра. «Юры Ярвет».
**18.55 Маст. фільм «Кароль Лір».**
21.15 Да 75-годдзя Кшыштафа Занусі. «Лінія жыцця».
**22.30 Маст. фільм «Садоўнік».**
0.05 Канцэрт аркестра Глена Мілера.
0.55 «Шукальнікі». «Тамплieры ў Савецкай Расіі».
1.40 «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Міжнародная панарама». 1978 год.
5.40 «Музычны кіёск». 1993 год.
6.15 «Амерыканскія інтэрв'ю». 1972 год.
**6.45, 12.45 Маст. фільм «Доўгія дні, кароткія тыдні».**
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 Па старонках перадач «...Да і пасля паўночы».
11.00 Дак. фільм «Вільнюс. Сустрэча М. Гарбачова з рабочымі завода паліўнай апаратуры».
11.55 Фільм-канцэрт «Спявае Палад Бюль-Бюль Аглы».
12.10 «Майстры экрана» Барыс Андрэеў. 1971 год.
16.00 «Погляд». 1988 год. 1-я частка.
17.00 «Калекцыя Капы». Творчы вечар пісьменніка В. Ардава. 1966 год.
18.15 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
18.25 Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа № 6: «Шантаж». 1-я серыя.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Кінапанарама». 70 гадоў кіно». 1989 год. 2-я частка.
23.00 Дак. фільм «Па Амерыцы».
23.40 «Музыка ў кінафільмах Эльдара Разанава». 1981 год.
**0.40 Маст. фільм «І гэта ўсё пра яго».**

### EUROSPORT

9.30, 12.30 Футбол. Бразіleманія.
9.45, 15.40, 18.40, 1.30 Тэніс. Турнір ATP.
12.00 Тэніс. «Матс пойнт».
12.45, 0.00 WATTS.
13.45 Лёгкая атлетыка.
15.30, 18.30, 21.30, 0.30 Футбол.
20.30 Конны спорт. Фехтаванне. Кубак нацый Ратэрдам.
22.00 Бокс. Чэмпіянат Сусветнай баксёрскай арганізацыі. J. Djeko (Бельгія) — F. Bluemle (Германія).
0.15 Конны спорт. Скачкі.
1.00 Ралі. ERC Бельгія.

### КАМЕДЫЯ

5.00, 2.00 Серыял «Старыя перцы».
5.30, 16.10, 21.50 Скетчком «Паміж намі».
5.45 Камедыя «Я і яго былыя».
7.25 Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».
9.00, 13.30, 16.30, 21.00 Серыял «Камп'ютаршчыкі».
9.50 Баявік «Няўдачнікі».
11.45 Камедыя «Сюрпрыз».
14.30 Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
17.20 Камедыя «Вялікі Руперт».
18.55 Камедыя «Каток».
19.20 Камедыя «Трое мужчын і немаўля».
22.10 Баявік «Кілеры».
23.45 Камедыя «Вандроўца».
0.15 Камедыя «Цыпачка».
3.00 Камедыя «Круты татачка».
4.30 Камедыя «Жанчына».

### ТБ3

6.00 М/ф.
8.35, 14.30 «Доктар І...».
9.00, 18.30, 2.00 Серыял «Забароненае каханне».
10.30, 4.20 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
12.15, 17.30 Дак. серыял «Справа Астахава».
13.10, 17.00 Дак. серыял «Простыя складанасці».
13.40 Серыял «Мар'ін гай».
15.00, 3.30 Серыял «Тайны следства».
16.00, 22.00 «Зорныя гісторыі».
20.10 Камедыя «Карсіканец».
22.40 «Гісторыі выратавання».
23.10 Маст. фільм «У імя караля».
1.15 Серыял «Белы каўнерык».

### ТБ1000

5.20 Камедыя «Мільён для чайнікаў».
7.30 М/ф «Гномеа і Джульета».
9.10, 17.10 Камедыя «Ужо хто б казаў 3».
11.00 Драма «Чалавек, якога не было».
13.10 Камедыя «З вачэй — далоў, з чарта — прэч!».
15.05 Трылер «Пералом».
19.00 Трылер «Вобласці цемры».
20.55 Трылер «Таемнае акно».
22.45 Драма «Доказ».
0.50 Драма «Небяспечны метад».
3.00 Баявік «Каралі Дагтаўна».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00, 3.00 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Сабака Баскервіляў».
8.50 Трагікамедыя «Пяць зорак».
10.40 Драма «Слон».
12.20 Драма «Водпуск у верасні».
15.00 Трагікамедыя «Кококо».
16.40 Драма «Балада пра бомбер».
20.00 Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
21.50 Меладрама «Будзь са мной».
23.20 Трылер «Кансервы».
1.20 Меладрама «Моцны шлюб».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
6.00, 12.00 Гульні розуму.
7.00, 19.00 Займальная навука.
8.00, 13.00 Космас.
10.00 Мегазаводы.
11.00 Цяжкае золата Аляскі.
15.00 Анаконда: каралева змей.
16.00 Экстрэмальнае падарожжа.
17.00, 2.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
18.00 Пляж.
20.00, 0.00, 3.00 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.
22.00 Браты па зброі.
23.00 Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

7.00 Гараж з нуля.
7.50, 12.20 Хлопцы з Юкана.
8.40, 20.05 Як гэта зроблена?
9.35 Ліквідатар.
10.30, 0.55 Top Gear.
11.25 Як уладкавана Зямля.
13.15, 16.00, 6.05 Махінатары.
14.10, 3.55 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
15.05 Голыя і напалоханыя.
17.20, 3.05 Каралі аўкцыёнаў.
18.15 Скарбашукальнікі Амерыкі.
19.10 Золаташукальніцы Аляскі.
21.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
21.30 Паляўнічыя на склады.
22.00 Брудныя грошы.
22.30 Багажныя войны.
23.00 Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
0.00, 5.10 Не спрабуйце паўтарыць.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.
4.45 Патрабуецца зборка.

## СУБОТА, 21 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

7.10 Існасць.
**7.35 Драма «Спакуса».**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Клуб рэдактараў.
**9.45, 23.25 Серыял «Сваты 4».**
10.55 «Пра ежу!».
11.30 Дача.
12.10, 15.30 Давярай і правярай.
12.50 Здароўе.
13.30 «Мастакі Парыжскай школы. Ураджэнцы Беларусі».
14.10 Вакол планеты.
15.15 Навіны рэгіёна.
16.05, 0.35 «Вялікая розніца».
**17.15 Меладрама «Іншая жанчына». 1-я — 4-я серыі.**
21.00 Панарама.
**21.40 Меладрама «Двойчы ў адну раку».**
0.25 Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.35 Фільм-казка «Золатавалоска».**
9.05, 17.20 Беларуская кухня.
9.40, 23.50 Тэлебарометр.
**9.45, 23.55 Серыял «Інтэрны».**
11.25 «Два з паловай кухары».
11.55 Вышэй за дах.
**12.30 Камедыя «Дракула: Мёртвы і задаволены гэтым».**
**14.20 Камедыя «Ідэальная пара».**
16.10 «Comedy woman».
17.10 Хачу ў тэлевізар!
17.15 Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
18.00 Ваша лата.
18.40 Латарэя «Пяцёрачка».
18.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Аргенціна — Іран.
20.55 Час футбола. Рыа-2014.
21.45 КЕНО.
21.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Германія — Гана.

### БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 11.30, 14.30, 16.50, 21.05, 0.20 «Калейдаскоп».
8.10, 11.40, 14.40, 17.00, 0.30 «Сімвалы эпохі». Казакі.
8.25 «Таямніца душы». Іканапіс Беларусі. Новае жыццё ікон.
8.50 «АРТіШОК». Творчасць скульптара Канстанціна Селіханава.
**9.20 «Мой ласкавы і пяшчотны звер». Маст. фільм.**
11.05 «Наперад у мінулае».
**11.55 «Узыходжанне». Маст. фільм.**
13.45 «Наша спадчына». Пояс караля Стэфанія Баторыя.
13.55, 16.20 «Размаўляем па-беларуску».
14.05 «Сёмае неба Паўла Масленікава». Дак. фільм.
14.55 «Дрысвяты. Песня і лёс». Дак. фільм.
15.30 «Лёс. Рэжысёр Сяргей Лазніца». Дак. фільм.
15.55 «Скарбніца Віцебшчыны». Дом Шагала.
16.30 «Лазер Алфёрава». Дак. фільм.
**17.15 «У чэрвені 41-га». Маст. фільм. 1-я — 4-я серыі.**
20.45 Калыханка.
21.15 Сусветнае кіно. «Трайны крыж».
23.25 «Нябачны фронт». Штрафбаты. Дак. фільм. Часткі 1-я — 4-я.

### БЕЛАРУСЬ 5

8.10, 14.25 Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
8.40 Футбол. Чэмпіянат свету. Італія — Коста-Рыка.
10.35 Футбол. Чэмпіянат свету. Швейцарыя — Францыя.
12.30 Футбол. Чэмпіянат свету. Гандурас — Эквадор.
15.00, 20.45 Тэніс. Турнір ВТА. Істбарн. Фінал.
17.00 Пляжны футбол. 1-ы этап Еўралігі. Швейцарыя — Беларусь.
18.15 Фактар сілы.
18.50 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «ФК Слуцк».
22.55 Футбол. Чэмпіянат свету. Аргенціна — Іран.
0.50, 4.45 Футбол. Чэмпіянат свету. Нігерыя — Боснія і Герцагавіна.
2.55 Футбол. Чэмпіянат свету. Германія — Гана.

### АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00, 20.30 Нашы навіны.
9.05 «Смяшарыкі». Новыя прыгоды.
9.30 «Здароўе».
10.35 «Смак».
**11.15 Маст. фільм «Бліндаж».**
15.05 «Гарады-героі. Смаленск».
16.15, 21.00 Навіны спорту.
16.25 «Эліна Быстрыцкая. Зорка эпохі».
**17.30 Маст. фільм «Няскончаная аповесць».**
19.25 «Пачуццё гумару».
21.05 «Вячэрні Мінск».
**22.15 Маст. фільм «Амадэй».**
1.05 «Цой — «Кіно».

### СТБ

**6.05 Серыял «Студэнты».**
7.45 «Анфас».
**8.00 Маст. фільм «Коткі супраць сабак».**
9.40 «Сакрэтныя тэрыторыі».
11.30 «Мінск і мінчане».
12.05 «Прыгоды дылетанта».
**12.40 Маст. фільм «Сын палка». 1-я серыя.**
14.00 «Ваенная тайна».
16.30, 19.30 «24 гадзіны».
16.45 «Наша справа».
17.00 «Вялікі горад».
17.40 «Дзіўная справа».
18.35 «Разумней не прыдумаеш».
20.00 «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Вакол свету за 80 дзён».**
22.20 «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». Група «Playback» супраць групы «Fortissimo».
**23.25 Маст. фільм «Адкрытае мора».**
0.50 «Вялікія тайны старажытнасці».

### МІР

5.00 М/ф.
**5.55 Маст. фільм «Школьны вальс».**
7.35 «Ой, мамачкі».
8.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
8.15 «Эксперыментатары».
8.30 «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 «Буба. В. Кікабідзэ».
**9.35 Маст. фільм «Міміно».**
**11.15 Серыял «Рабіны гронкі пунсовыя».**
14.30, 1.40 Скетч-шоу «МасГарСмех».
**15.10 Серыял «Хірамант».**
19.40 «Навіны культуры».
**20.20 Маст. фільм «Чалавек года».**
**22.25 Маст. фільм «Сямейка Ады».**
**0.05 Маст. фільм «У Маскве, праездам...».**
**2.10 Маст. фільм «Сэрцы чатырох».**
3.50 Дак. фільм «Тайныя знакі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 Маст. фільм «Аблудны».**
**8.25 Маст. фільм «Зваротны шлях».**
10.20 «Ранішняя пошта».
11.00, 14.00 Весткі.
11.10 «Зямля герояў».
11.45 «Планета сабак».
**12.20 Серыял «Мора па калена».**
14.15 М/ф.
**14.35 Маст. фільм «Падары мне крышку цеплыні».**
16.25 «Смяяцца дазваляецца».
18.05 «Суботні вечар».
19.55 Надвор'е на тыдзень.
20.00 Весткі ў суботу.
**20.45 Маст. фільм «Шэсць сотак шчасця».**
**22.30 Маст. фільм «Раман у пісьмах».**
0.10 1/4 фіналу Цэнтральнай Міжнароднай лігі КВЗ.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Агляд».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Справа густу».
10.20 «Галоўная дарога».
10.50 «Кулінарны паядынак».
11.55 «Кватэрнае пытанне».
13.20 «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**14.15 Маст. фільм «Кроўныя браты».**
16.15 «Выратавальнікі».
16.45 «Следства вялі...».
17.35 «Вочная стаўка».
18.25 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Цэнтральнае тэлебачанне».
19.55 Новыя рускія сенсацыі.
20.55 «Ты не паверыш!».
**21.55 Маст. фільм «Адзін дзень».**
**23.40 Баявік «Атрад асаблівага прызначэння».**

### 8 КАНАЛ

9.00, 12.00, 19.00, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
9.25 «Героі коміксаў на экране». «Страла».
11.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.10 Серыял «Да смерці прыгожая».**
**12.05 Баявік «Паўторны ўдар».**
**13.50 Прыгоды «Апошні легіён».**
15.30 «Тэлемагазін».
16.00 «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Камедыя «Шалёная пятніца».**
**18.10 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**19.05 Меладрама «Шэпт анёлаў».**
20.45 «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Востраў».**

### ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY”.
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
10.00 «Міксер».
12.00 «Спытайце кухара».
**13.00 Серыял «Аманда О».**
**15.00 Трылер «Спрытныя грошы».**
17.00, 0.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
17.30 «Уральскія пельмені».
**19.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**20.30 Драма «Кацiся!».**
23.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.30 «Лаві момант».

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 Біблейскі сюжэт.
**9.35 Маст. фільм «Кароль Лір».**
11.50 Вялікая сям'я. Ніна Усатава.
12.45, 0.55 Дак. фільм «Нільскія кракадзілы, якія перажылі фараонаў».
13.40 Канцэрт да пятай гадавіны інтранізацыі Найсвяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла.
14.45 Красуйся, горад Пятроў!
**15.15 Маст. фільм «Пажнеш буру».**
17.20 Да 80-годдзя з дня нараджэння Юрыя Візбара. «Больш, чым каханне».
17.55 Юрыю Візбару і Адзе Якушавай прысвячаецца... Канцэрт у Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**19.15 Маст. фільм «З жыцця адпачывальнікаў».**
20.35 «Белая студыя». Аляксандр Дамагараў.
21.15 Спектакль Андрэя Канчалоўскага «Дзядзька Ваня».
23.40 Джон Ленан. Канцэрт у Нью-Ёрку.
0.40 М/ф для дарослых «Пісьмо».
1.50 Дак. фільм «Франц Фердынанд».

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 Дак. фільм «Вільнюс. Сустрэча М. Гарбачова з рабочымі завода паліўнай апаратуры».
5.55 Фільм-канцэрт «Спявае Палад Бюль-Бюль Аглы».
6.10 «Майстры экрана» Барыс Андрэеў. 1971 год.
**6.45, 0.45 Маст. фільм «Доўгія дні, кароткія тыдні».**
8.00, 14.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00 «Погляд». 1988 год. 1-я частка.
11.00 «Калекцыя Капы». Творчы вечар пісьменніка В. Ардава. 1966 год.
12.15 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**12.25 Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа № 6: «Шантаж». 1-я серыя.**
15.00 «Колба часу».
16.00 «Кінапанарама». 70 гадоў кіно». 1989 год. 2-я частка.
17.00 «Што? Дзе? Калі?». 1988 год. 1-я частка.
17.55 «Ранічкаю»: «Міні-ЦТ». 1991 год.
18.30 «Аўтограф па суботах». 1993 год.
19.30 Дак. фільм «Перш за ўсё — тэатр».
20.40 «Смехапанарама». 1994 год.
**21.20 Маст. фільм «Песня першага кахання».**
23.00 «Міжнародная панарама». 1978 год.
23.40 «Музычны кіёск». 1993 год.
0.15 «Амерыканскія інтэрв'ю». 1972 год.
4.00 Па старонках перадач «...Да і пасля паўночы». 3-я частка.

### EUROSPORT

9.30, 12.30 Футбол. Бразілеманія.
9.45, 1.00 Ралі. ERC Бельгія.
10.20, 18.45, 1.30 Тэніс. Турнір ATP.
12.45 Лёгкая атлетыка.
13.30, 15.40, 20.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.
15.30, 18.00, 21.30, 0.30 Футбол.
18.10 Тэніс. «Матс пойнт».
21.00 Конны спорт. Скачкі.
22.00 Суперкомбат. Серыя WGP.

### КАМЕДЫЯ

5.00, 13.30, 21.00 Камедыя «Трайная непрыемнасць».
5.20, 13.50, 21.25 Камедыя «Паліцыя».
5.50 Камедыя «Няўдачнік Альфрэд, або Пасля дажджу... дрэннае надвор'е».
7.25 Камедыя «Сюрпрыз».
8.55, 16.30, 2.00 Камедыя «Шукальнік прыгод».
9.20, 16.55, 2.30 Камедыя «За экранам».
9.45 Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
11.25, 21.50, 23.55, 4.40 Скетчком «Паміж намі».
11.45 Камедыя «Вялікі Руперт».
14.20 Баявік «Кілеры».
16.00 Камедыя «Кантралёр універмага».
17.20 Камедыя «Трое мужчын і немаўля».
19.20 Камедыя «Трое мужчын і маленькая лэдзі».
22.10 Камедыя «Ашуканцы».
0.15 Баявік «Няўдачнікі».
3.00 Камедыя «Цыпачка».

### ТБ3

6.00 М/ф.
10.00, 5.05 Серыял «Залатая цешча».
11.00 «Сардэчна запрашаем дадому!».
11.45 «Гісторыі выратавання».
12.15, 0.45 «Таямніцы нашага кіно. «Лёс рэзідэнта».
12.45, 1.15 Маст. фільм «Лёс рэзідэнта».
15.30, 0.00 Дак. фільм «Знахар 21 стагоддзя».
16.20 М/ф «Монстар у Парыжы».
17.40, 3.45 Дак. фільм «Знакі лёсу».
19.10 Маст. фільм «Апошні забой».
21.00 Маст. фільм «Доктар «Т» і яго жанчыны».
23.15 Серыял «Белы каўнерык».

### ТБ1000

5.20 Драма «Чалавек, якога не было».
7.40, 15.30 Трылер «Таемнае акно».
9.30 Трылер «Пералом».
11.40, 19.00 Баявік «Каралі Дагтаўна».
13.45 Драма «Зрабі крок».
17.20, 3.05 Жахі «Ідэнтыфікацыя».
21.00 Камедыя «Калі свякроў — монстр».
22.55 Меладрама «Нешта новенькае».
0.50 Камедыя «Каханне з апавяшчэннем».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».
8.50 Драма «Слон».
10.30 Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».
12.50 Драма «Мілы, дарагі, любімы, адзіны...».
14.10 Драма «Золата».
16.20 Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
18.10 Камедыя «Матулі».
20.00 Камедыя «Дзед 005».
21.45 Камедыя «Рэальны тата».
23.25 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Знаёмствы».
0.45 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Крывавы надпіс».
2.00 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Кароль шантажу».
3.15 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Смяротная сутычка».
4.30 Дэтэктыў «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: Паляванне на тыгра».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
6.00 Пляж.
7.00 Рыбы-пачвары.
8.00 З пункту гледжання навукі.
9.00 Навука будучыні.
10.00 Гульні розуму.
11.00, 17.00 Космас.
13.00 У пошуках выкрадзеных Гітлерам скарбаў.
14.00 Каралева гіен.
15.00 Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
16.00 Пахаванне Тутанхамона.
18.00, 2.00 Займальная навука.
19.00 Машыны: разабраць і прадаць.
20.00, 0.00, 3.00 Дзікі тунец.
22.00 Панарама 360°.
23.00 Забароны ЗША.

### DISCOVERY

7.00 Патрабуецца зборка.
7.25, 19.10 Рэальныя дальнабойшчыкі.
8.15, 13.40 Новае жыццё рэтра-аўтамабіляў.
9.10, 2.40 Голыя і напалоханыя.
10.05, 17.20 Золаташукальніцы Аляскі.
11.00, 6.05 Ліквідатар.
11.50, 21.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
12.45, 22.30, 5.10 Багажныя войны.
14.35 Новае жыццё хот-родаў.
15.30 Паляўнічыя на аўтамабілі.
16.25 Забойныя дылемы.
18.15, 3.30 Дамы на дрэвах.
20.05 Смяротныя астравы.
21.30 Паляўнічыя на склады.
22.00 Брудныя грошы.
23.00 Самагоншчыкі.
0.00 Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
1.50 Навука магіі.
4.20 Маланкавыя катастрофы.
4.45 Як гэта зроблена?

## НЯДЗЕЛЯ, 22 ЧЭРВЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25 Меладрама «Двойчы ў адну раку».**
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Арсенал.
**9.40, 23.55 Серыял «Сваты 4».**
10.50 «Пра ежу!».
11.25 «XXL WOMAN TV».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 «Зона Х».
13.10 Каробка перадач.
13.50 «Мастакі Парыжскай школы. Ураджэнцы Беларусі».
14.25 Дыялогі аб цывілізацыі.
15.15 Твой горад.
15.30 «Славянскі базар у Віцебску-2014». Дзённік.
15.55 «Зорнае жыццё». «У палоне праклёну».
**16.55 Баявік «У жніўні 44-га ...».**
**19.05 Драма «Спакуса».**
20.40 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
21.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Паўднёвая Карэя — Алжыр.

### БЕЛАРУСЬ 2

7.20 М/ф «Казка пра залатога пеўнічка».
**7.50 Фільм-казка «Русалачка».**
9.20 Заўтра — гэта мы!
9.50, 16.45, 21.55 Тэлебарометр.
9.55 «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
10.25 Стыль-бюро.
11.00 Аўтабатл.
**11.40, 23.40 Кінааповесць «У бой ідуць адны «старыя».**
**13.25 Баявік «Снайпер-2. Тунгус». 1-я — 4-я серыі.**
17.20 Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
18.00 Суперлата.
18.50 Футбол. Чэмпіянат свету. Бельгія — Расія.
20.55 Час футбола. Рыа-2014.
21.45 Спортлата 5 з 36.
21.50 КЕНО.
22.00 «Эдуард Арцем'еў. Музыка пакаленняў». Канцэрт.

### БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 12.35, 14.55, 21.05, 0.50 «Калейдаскоп».
**8.10 «У чэрвені 41-га». Маст. фільм. 1-я — 4-я серыі.**
11.40 «Нябачны фронт». Штрафбаты. Дак. фільм. Часткі 1-я — 4-я.
12.45 «Залаты Віцязь. Мікалай Бурляеў». Дак. фільм.
13.45 Л.-В. Бетховен. Сімфонія № 9 рэ мінор, ар.125.
15.05 «Камертон». Народная артыстка Расіі Святлана Кручкова.
15.30 «Жывыя сведкі леднікоў». Дак. фільм.
16.15 «Шляхамі Адама Міцкевіча». Родныя мясціны паэта ў Навагрудку.
16.35 «Наперад у мінулае».
17.00 Дзіцячы фільм. «Пра Віцю, пра Машу і марскую пяхоту».
18.05, 22.55 «Культпрасвет».
18.35 Сусветнае кіно. «Трайны крыж».
20.45 Калыханка.
21.15 «Песні ваенных гадоў». Канцэрт.
23.20 В. Быкаў. «Апошні шанц». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

### БЕЛАРУСЬ 5

7.50, 15.10 Футбол. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
8.20 Футбол. Чэмпіянат свету. Аргенціна — Іран.
10.10 Футбол. Чэмпіянат свету. Германія — Гана.
12.05 Футбол. Чэмпіянат свету. Нігерыя — Боснія і Герцагавіна.
13.55 Пляжны футбол. 1-ы этап Еўралігі. Швейцарыя — Беларусь.
15.40, 20.55 Пляжны футбол. 1-ы этап Еўралігі. Беларусь — Германія.
16.55 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
18.55 Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі. «БАТЭ» — «Гомель».
21.45 Гандбол. ЧС-2015. Плэй-оф. Беларусь — Чарнагорыя. Мужчыны.
23.00 Футбол. Чэмпіянат свету. Бельгія — Расія.
0.55, 4.55 Футбол. Чэмпіянат свету. ЗША — Партугалія.
3.00 Футбол. Чэмпіянат свету. Паўднёвая Карэя — Алжыр.

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 Нядзельная пропаведзь (з субцітрамі).
9.20 «Пакуль усе дома».
**10.10 Маст. фільм «Знак бяды».**
12.50 «Гарады-героі. Тула».
13.50, 16.20 Дзень памяці і смутку. «Вайна і міфы».
16.15 Навіны спорту.
20.00 Контуры.
**21.05 Маст. фільм «У тумане».**
**23.25 Маст. фільм «Адваротны бок паўночы».**

### СТБ

**6.05 Маст. фільм «22 чэрвеня, роўна ў 4 гадзіны...».**
**7.50 Маст. фільм «Вакол свету за 80 дзён».**
10.00, 17.50 «Аўтапанарама».
10.30 «Тайны свету».
11.30 «Вялікае снеданне».
12.10 «Прывітанне, доктар».
**12.45 Маст. фільм «Сын палка». 2-я серыя.**
14.10 Тэрыторыя памылак.
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.30 «24 гадзіны».
16.50 «Чатыры вяселлі».
18.20 «На тым жа месцы ў той жа час».
19.30 «Тыдзень».
**20.40 Маст. фільм «Пайсці і не вярнуцца».**
22.10 «Вялікія тайны часу».
**0.40 Маст. фільм «Каханне».**

### МІР

**5.00 Маст. фільм «З каханымі не расставайцеся».**
6.20 М/ф.
7.40 «Зямля і неба».
8.05 «Ведаем рускую».
9.00, 15.00 Навіны Садружнасці (бягучы радок).
9.10 Прыгоды Македонскай.
9.20, 4.20 «Нітка да ніткі».
**9.45, 1.05 Маст. фільм «Абавязак вышэй за ўсё».**
**12.55 Маст. фільм «Як важна быць сур'ёзным».**
14.35 Скетч-шоу «МасГарСмех».
**15.10, 21.00 Серыял «Хірамант».**
20.00 «Разам».
**21.35 Маст. фільм «Жыві і памятай».**
**23.25 Маст. фільм «Жорсткасць».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00, 12.30 Маст. фільм «Прывітанне з фронту».**
**8.15 Маст. фільм «Мы з будучыні».**
10.10 «Сам сабе рэжысёр».
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Смехапанарама».
11.45 «У свеце жывёл».
12.20 М/ф.
14.15 Да юбілею кінастудыі. «Масфільм». 90 крокаў».
14.30 «Мая планета».
14.45 «Вясельны генерал».
15.35 Дзень памяці і смутку. Маст. фільм «Трэцяга не дадзена».
18.45 Дзень памяці і смутку. Маст. фільм «Аперацыя «Тайфун». Заданні асаблівай важнасці».
22.00 Весткі тыдня.
23.55 «Нядзельны вечар».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Медыцынскія тайны».
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома!».
10.20 «Першая перадача».
10.50 «Цуд тэхнікі».
11.20 «Паедзем, паядзім!».
11.55 «Дачны адказ».
**13.20 «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.**
**14.15, 16.15 Серыял «УГРО-5».**
18.00 «І зноў прывітанне».
18.25 Надзвычайнае здарэнне.
19.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
**19.50 Серыял «Белы чалавек».**
23.20 «Школа зласлоўя».

### 8 КАНАЛ

9.00, 12.55, 18.45, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
9.05 «Мультпарад».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
**10.30 Трылер «Востраў».**
**13.00 Драма «Герой».**
14.45 «Тэлемагазін».
**15.45 Серыял «Камісар Рэкс».**
17.25 Ток-шоу «Бульбокс».
**17.55 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**18.50 Меладрама «Маладая Вікторыя».**
20.45 «Вечарніца».
**21.00 Драма «Выклік».**

### ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.30 М/ф «Смяшарыкі».
**9.00 Серыял «Татавы дочкі».**
10.00 «Міксер».
12.00 Паспець за 24 гадзіны.
13.00, 0.30 «Лаві момант».
13.30, 22.45 Скетч-шоу «6 кадраў».
14.00 «Кіно ў дэталях».
**15.00 Серыял «Васьмідзясятыя».**
**16.30 Драма «Кацiся!».**
19.00 «Уральскія пельмені».
**20.30 Камедыя «Мы — легенды».**
23.30 «Нерэальная гісторыя».
0.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 Дзень памяці і смутку — дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «І ўсё-такі мы перамаглі!». Кінаканцэрт.
**9.40 Маст. фільм «Хлопец з нашага горада».**
11.05 «Легенды сусветнага кіно». Мікалай Кручкоў.
11.35 Расія, любоў мая!
12.05 Геніі і ліхадзеі. Уладзімір Обручаў.
12.35, 0.55 Дак. фільм «Закінутая лагуна».
13.25 Дак. фільм «Дом на гульвары».
14.20 «Музычная кулінарыя. Пучыні і Лука».
15.15 «Шукальнікі». «У пошуках скарбаў Царскага Сяла».
16.00 «Апошнія вольныя людзі». «Жыццё без межаў».
17.00 «Кантэкст».
17.40, 23.40 Па слядах тайны. «Што было да Вялікага выбуху?».
18.30 Дак. фільм «Яўген Мацвееў».
**19.10 Маст. фільм «Родная кроў».**
20.35 «Тыя, з якімі я... Міхаіл Ром».
21.25 Дак. фільм «Звычайны фашызм».
0.30 М/ф для дарослых «Містар Пронька».
1.50 Дак. фільм «Рафаэль».

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Калекцыя Капы». Творчы вечар пісьменніка В. Ардава. 1966 год.
6.15 «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**6.25 Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа № 6: «Шантаж». 1-я серыя.**
8.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00 «Колба часу».
10.00 «Кінапанарама». 70 гадоў кіно». 1989 год. 2-я частка.
11.00, 17.00 «Што? Дзе? Калі?». 1988 год.
11.55 «Ранічкаю»: «Міні-ЦТ». 1991 год.
12.30 «Аўтограф па суботах». 1993 год.
13.30 Дак. фільм «Перш за ўсё — тэатр».
14.40 «Смехапанарама». 1994 год.
**15.20 Маст. фільм «Песня першага кахання».**
17.50 Фільм-канцэрт «Дзякуй за нялётнае надвор'е».
18.50 «Аншлаг! Аншлаг!». 1988 год.
19.55 «Падарожжа падчас канцэрта». Спявае Джані Марандзі. 1983 год.
21.05 «Тэатральныя сустрэчы». 1977 год.
22.35 «Мелодыі і рытмы Кубы». Канцэрт.
23.00 Дак. фільм «Вільнюс. Сустрэча М. Гарбачова з рабочымі завода паліўнай апаратуры».
23.55 Фільм-канцэрт «Спявае Палад Бюль-Бюль Аглы».
0.15 «Майстры экрана» Барыс Андрэеў. 1971 год.
**0.45 Маст. фільм «Доўгія дні, кароткія тыдні». 2-я серыя.**
3.00 «Народжаныя ў СССР».
4.00 «Погляд». 1988 год. 1-я частка.

### EUROSPORT

9.30, 12.30 Футбол. Бразілеманія.
9.45, 2.00 WATTS.
10.00, 18.00 Гран-пры 3.
11.00, 13.30 Чэмпіянат свету ў класе Турынг.
11.30, 18.40 Супербайк. Чэмпіянат свету.
12.45 Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ.
15.30, 18.30, 21.30, 0.30 Футбол.
15.40, 22.00 Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.
0.15, 2.15 Аўта- і мотаспорт.
1.00 Настольны тэніс. Японія. Фіналы.

### КАМЕДЫЯ

5.00, 13.30, 21.00 Камедыя «Шукальнік прыгод».
5.25, 13.55, 21.25 Камедыя «За экранам».
5.50 Камедыя «Сюрпрыз».
7.25 Камедыя «Вялікі Руперт».
8.55, 16.30, 2.10 Камедыя «Трайная непрыемнасць».
9.15, 16.50, 2.30 Камедыя «Паліцыя».
9.45 Баявік «Кілеры».
11.25, 21.50, 0.00, 1.50, 4.40 Скетчком «Паміж намі».
11.40 Камедыя «Трое мужчын і немаўля».
14.20 Камедыя «Ашуканцы».
16.00 Камедыя «Імігрант».
17.20 Камедыя «Трое мужчын і маленькая лэдзі».
19.20 Камедыя «Водпуск у наручніках».
22.10 Прыгоды «Янкі пры двары караля Артура».
0.15 Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
3.00 Баявік «Няўдачнікі».

### ТБ3

6.00 М/ф.
9.50, 3.55 Серыял «Залатая цешча».
10.50 «Паненка і кулінар».
11.20, 1.45 Серыял «Зоя». Заключныя серыі.
13.15 «Жонка. Гісторыя кахання». Анастасія Валачкова.
14.40 «Сто пытанняў даросламу». Наталля Селязнёва.
15.30 «Без падману».
16.15 Маст. фільм «Апошні забой».
18.05, 0.25 Дак. фільм «Аляксандр Барыкін. Недайграны канцэрт».
19.35 Маст. фільм «Уцёкі з Шаўшэнка».
22.10, 3.30 «Асцярожна, ашуканцы!».
22.40 «Часова даступны». Уладзімір Мядзінскі.
23.40 Серыял «Белы каўнерык».

### ТБ1000

5.00 Меладрама «Нешта новенькае».
7.15 М/ф «Рабі ногі».
9.20 Камедыя «Каханне з апавяшчэннем».
11.20 Камедыя «Калі свякроў — монстр».
13.20 Жахі «Ідэнтыфікацыя».
15.10 Трылер «Вобласці цемры».
17.10 Камедыя «Мільён для чайнікаў».
19.00 Трылер «Невідзімка».
21.05 Драма «Небяспечны метад».
22.50 Драма «Успаміны няўдачніка».
0.45 Драма «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы».
3.10 Меладрама «Блакітная хваля».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.00, 2.55 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: 20 стагоддзе пачынаецца».
8.55 Драма «Балада пра бомбер».
12.05 Камедыя «Набожная Марта».
14.55 Камедыя «Дублёр».
16.30 Камедыя «Востраў шанцавання».
18.10 Камедыя «Нявеста любой цаной».
20.00 Камедыя «Шапіто-шоу: Каханне і сяброўства».
22.00 Камедыя «Шапіто-шоу: Павага і супрацоўніцтва».
0.05 Дэтэктыў «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана: Скарбы Агры».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 12.00 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
6.00 Рыбы-пачвары.
8.00 З пункту гледжання навукі.
9.00 Навука будучыні.
10.00 Пляж.
11.00, 17.00 Космас.
13.00 Патанулая субмарына фашыстаў.
14.00 Апошні тыгр Суматры.
15.00 Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
16.00 Перш за ўсё — самалёты.
18.00, 23.00 Займальная навука.
19.00 Машыны: разабраць і прадаць.
20.00, 0.00, 3.00 Аўта-SOS.
21.00, 1.00, 4.00 Аўтарэстаўратары.
22.00, 2.00 Мегазаводы.

### DISCOVERY

7.00 Патрабуецца зборка.
7.25, 22.30 Багажныя войны.
8.15, 4.20 Як гэта зроблена?
9.10 Смяротныя астравы.
10.05 Ліквідатар.
11.00 Круцей не прыдумаеш.
11.50 Навука магіі.
12.45 Дынама — неверагодны ілюзіяніст.
14.35 Скарбашукальнікі Амерыкі.
15.30 Золаташукальніцы Аляскі.
19.10 Апакаліпсіс Дэрэна Браўна.
20.05, 3.30 Разбуральнікі легенд.
21.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
21.30 Паляўнічыя на склады.
22.00 Брудныя грошы.
23.00, 2.40 Забойныя дылемы.
0.00 Хлопцы з гарматамі.
0.55 Самагоншчыкі.
1.50 Спецатрад на заданні.
5.10 Новае жыццё хот-родаў.
6.05 Паляўнічыя на аўтамабілі.

■ Зялёнае свята

# ТЫЯ ЯШЧЭ КВЕТАЧКІ

## ПРАФЕСІЯ «РАБОЧЫ ЗЯЛЁНАГА БУДАЎНІЦТВА» НЕ ТОЛЬКІ ПРЫГОЖАЯ, АЛЕ І ЗАПАТРАБАВАНАЯ

**Людзі ў яркім спецадзенні, скрыні з расадай, садовы інвентар — гледзячы на ўсё гэта, можна падумаць, што ў сталічным парку Горкага праходзіць глабальны суботнік. Толькі вось на календары не субота, ды і сама праца ідзе даволі арыгінальна: на адным лужку на дзесяці аднолькавых квадратах 2x2 метры шчыруюць па дзве жанчыны. І яшчэ з паўдзясятка іх каляжанак стаяць побач і падбадзёрваюць кабет. А падтрымка ім неабходна, бо да фінальнага этапу гарадскога конкурсу прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар — 2014» па прафесіі «рабочы зялёнага будаўніцтва» дайшлі самыя лепшыя, і цяпер яны гатовы паказаць усе свае ўменні, каб перамагчы.**



*У Беларусі пакуль што нешматлікія ўстановы адукацыі рыхтуюць умельцаў-азеляняльнікаў. Галоўнай кузняй кадраў для «Мінскзеленбуда» з'яўляецца Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт. Навучыцца майстэрству разбіўкі газонаў і стварэння кветкавых кампазіцый можна на лесагаспадарчым факультэце ўстановы: будучых спецыялістаў чакаюць на кафедры ландшафтнага праектавання і садова-паркавага будаўніцтва.*

**Лёгкі рух бензанажніц — і дрэвы набываюць мудрагелістыя формы.**

### Свет ратуе прыгажосць

Сёлета конкурс адзначае юбілей — праводзіцца ўжо дзясяты раз. Удзельнічаюць у ім прадпрыемствы зелянбуда ўсіх дзевяці раёнаў Мінска, у тым ліку ўпраўленне «Цэнтр», а таксама ўпраўленне па ахове раслін. Спаборніцтвы ладзяцца ў два этапы: спачатку пераможца вылучаецца ў кожным раёне, а пасля ў фінале выбіраюць самую лепшую каманду. Дэвіз сёлетняга конкурсу — кветкавыя кампазіцыі для дзяцей у любімым парку. Такім чынам арганізатары ўкладаюць у яго і выхаваўчы аспект: прыходзячы з бацькамі ў парк, дзеці будуць бачыць прыгожыя клумбы і вучыцца беражліва ставіцца да іх. Дарэчы, спецыялісты адзначаюць, што гэта дае плён: за апошнія гады фіксуецца ўсё менш выпадкаў крадзяжоў з клумбаў і іншага вандалізму.

Ды і як можна разбураць такую прыгажосць, асабліва калі назіраеш, як яна ствараецца? Вось проста стаяць скрыні з рознымі кветкамі, але за некалькі хвілін пад спрытнымі рукамі вопытных майстроў з раслін вымалёўваюцца мудрагелістыя ўзоры, складваюцца выкшталцоныя мазаікі, узнікаюць завершаныя кампазіцыі са сваім настроем, характарам і сэнсам. І ўжо не верыцца, што паласаты кот-летуценнік ці дзелавітая качка пад парасонам, альбо вясёлы смоўж створаны з дзясяткаў відаў кветак, назвы якіх, як ні старайся, з першага разу не запомніш. А работнікі зелянбуда ведаюць іх назубок. Менавіта дзякуючы іх працы наш горад называюць самым зялёным і прыгожым: падумаць толькі — іх рукамі сёлета ў Мінску высаджана 1,7 млн кветак!..



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

**Будучы смоўж ад каманды ўпраўлення «Цэнтр» УП «Мінскзелянбуд».**

### Убачыць у дрэве характар

Але ці так лёгка даецца гэтая прыгажосць? Дакладны адказ на гэтае пытанне ведаюць тапіяршчыкі — майстры па фігурнай абрэзцы кустоў, што працуюць непадалёк ад асноўнай конкурснай пляцоўкі. Аляксандр Сак і Сяргей Шапяцько надаюць замыславатую форму высаджаным тут туям. На пытанні адказваюць неахвотна, але як толькі размова заходзіць пра тонкасці справы, якой яны займаюцца ўжо дзясяты сезон, іх вочы запальваюцца, і мужчыны пачынаюць гаварыць як сапраўды апантаныя прафесіяналы.

— У кожным дрэве нешта адразу відаць, з першага погляду ўяўляеш, што з гэтага можа атрымацца, — дзеліцца Сяргей Шапяцько. — Усё індывідуальна, як у людзей можна разгледзець нейкія здольнасці і схільнасці, так і тут — будзе гэта спіраль, шар ці піраміда.

Тапіярная стрыжка — справа карпатлівая, тут трэба не толькі мець мастацкі густ і ідэальны вакамер, але і ведаць, што можна адрэзаць, а што неабходна пакінуць, каб дрэва не загінула. Увесь сакрэт у вопыце, запэўніваюць майстры і… прапануюць мне паспрабаваць пастрыгчы тую. Дрыготкімі рукамі бяру прафесійны інструмент — бензанажніцы, і пачынаю марудна праводзіць імі па краі дрэва. Усе лішнія галінкі адлятаюць ад лёгкага дотыку машыны, але ж трымаць яе ў руках цяжка. За дзень працы можна някепска натрэніравацца — і ніякіх трэнажораў не трэба. Не паспеўшы нарабіць бяды, перадаю інструмент майстру, і ён спрытна за некалькі хвілін робіць з туі дасканалую піраміду.

### Каранаванне жабкі

Тым часам на асноўнай конкурснай пляцоўцы праца рушыць да завяршэння, але тым большы рух і тым большае напружанне адчуваецца сярод удзельнікаў. Хтосьці распыляе над жоўтымі аксаміткамі балончык з фарбай — і вось яны ўжо робяцца блакітнымі. Хтосьці падобным чынам пры дапамозе спецыяльнага трафарэту фарбуе мармуровую крошку. Нехта ўпрыгожвае свае кампазіцыі паветранымі шарыкамі. Завяршальныя ўзмахі нажніц, грабляў і леек — і час выйшаў. У апошнія хвіліны перад аглядам журы майстры ўголас прагаворваюць свае прэзентацыі.

— Журы ацэньвае канкурсантаў па некалькіх крытэрыях, — распавядае **старшыня Аб'яднанага камітэта прафсаюза УП «Мінскзелянбуд» Аляксандр САЛАНОВІЧ.** — Спачатку ўдзельнікі здавалі тэарэтычны экзамен па білетах, пасля пачалася практычная частка. Яе першы этап — разбіўка газона, пасля ставяць балы за падбор расады, за хуткасць выканання работы (на ўсё пра ўсё давалася дзве гадзіны), і нарэшце журы выносіць ацэнку за абарону прадстаўленай кампазіцыі.

Высветлілася, што без прэзентацыі вызначыць пераможцу цяжка: усе працы атрымаліся яркімі, цікавымі і ў прамым сэнсе расквяцілі паркавую паляну. Але ж менавіта ўменне падаць свой твор уздымае пераможцу на вяршыню. Канкурсанты расказваюць пра свае работы, прычым не толькі пералічваюць выкарыстаныя расліны і дэкаратыўныя матэрыялы, але і зачытваюць пра іх вершы. Удзельніцы, даволі сталыя жанчыны, хвалююцца, як школьніцы, і ставяцца да сваіх кампазіцый як да жывых істот. Публіка ўспрымае прэзентацыі горача, а неўзабаве свой вердыкт выносіць і журы: першае месца ў конкурсе заваёўвае каманда УП «Зелянбуд Маскоўскага раёна» з яркай і сапраўды вартай перамогі кампазіцыяй «Царэўна-жабка». Яе стваральніцы Тамара Рацкевіч і Лілія Мікша прызнаюцца: не думалі, што атрымаюць першае месца. Але ж недарэмна выбралі менавіта такі персанаж для сваёй кампазіцыі: у казцы жабка ператвараецца ў прыгажуню. Атрымліваецца, і ў жыцці здараюцца цуды — вядома, у тых, хто ў іх верыць.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■ На слыху

## ЗА ЎСЁ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

**Буйную самагонную вытворчасць дапамагла выявіць праваахоўнікам на тэрыторыі рэспубліканскага ландшафтнага заказніка «Налібоцкі» ў Стаўбцоўскім раёне мясцовая жыхарка.**

Як паведамілі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінаблвыканкама, жанчына паскардзілася на «прамую лінію», што яе муж атрымаў зарплату і некалькі дзён не ходзіць на работу. Грошы траціць на самагонку. Заяўніца назвала і магчымае месца, дзе гоняць самагон.

Праваахоўнікі выехалі для праверкі фактаў. Непадалёку ад аграгарадка «Налібокі» яны затрымалі «на гарачым» двух маладых мужчын. На беразе рэчкі ў лесе было выяўлена каля 2 тон брагі і 80 літраў самагону. Непадалёк стаяў трактар з прычэпам. Для дэмантажу самагоннага апарата, вагой у некалькі тон, давялося выкарыстаць спецыяльную тэхніку.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ А не шкодзь!

## СА СТРЭЛЬБАЙ НА... КАРАСЯ

**Папаляваць на рыбу ноччу вырашылі два браты з вёскі Кублічы Ушацкага раёна. Выбралі возера Белае, што мяжуе з Глыбоччынай.**

Аматараў экзотыкі не спыніла нават тое, што яны парушалі як мінімум тры пункты правілаў: па-першае, «палявалі» ноччу, па-другое, з дапамогай фары і акумулятара, па-трэцяе, стралялі гарпуном са стрэльбы для падводнага палявання з лодкі — а значыць, не знаходзячыся ў вадзе. Як паведаміў рэдакцыі **начальнік Глыбоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Аляксей ПРОТАС,** браканьераў затрымалі з доказамі віны каля дзвюх гадзін ночы. Здабычай гора-«паляўнічых» сталі такія віды рыбы, як карась, лінь, шчупак. У колькі абыдзецца правапарушальнікам начное «сафары», вызначыць суд.

**Ул. інф.**


**КАЛІ ВЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»**
**на III квартал або II паўгоддзе 2014 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце ДА 5 ЛІПЕНЯ 2014 ГОДА ў рэдакцыю на адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.**




Сярод падпісчыкаў 11.07.2014 года будзе разыграна 7 сушылак для агародніны і 3 трымеры. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 21.07.2014 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31.09.2014 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2014 г. і пашпарта. Пасля 31 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.**
**ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ ГУЛЬНІ — з 5.06.14 па 30.09.14.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2255 ад 30.10.13, выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

**4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2014 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
____________________ на III кв. або 2-е паўг. 2014 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] ____________________
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!


# ЖЫЦЬ СВАБОДНЫМ АД БОЛЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па ацэнцы экспертаў, 60% пацыентаў, якім патрабуецца паліятыўная дапамога, складаюць анкалагічныя хворыя, а 40% — пацыенты з іншымі захворваннямі.

Калі казаць пра Беларусь, то наша краіна адстала ад усяго свету ў аказанні паліятыўнай дапамогі на шмат гадоў. Беларускі дзіцячы хоспіс быў створаны па ініцыятыве Рэспубліканскага дзіцячага анкагематалагічнага цэнтра ў 1994 годзе. Аднак прайшло больш як дзесяць гадоў, перш чым у Беларусі адкрыўся першы дзяржаўны хоспіс для дарослых. Прычым з 2005 па 2008 год ён існаваў як пілотны праект. Спецыялісты тлумачаць, што наладзіць сістэму дзейнасці дзіцячага хоспіса было значна лягчэй, таму што маштабы няшчасця ўсё ж такі значна меншыя…

Паколькі школа паліятыўнай дапамогі ў Беларусі яшчэ толькі фарміруецца, у медыцынскіх работнікаў застаецца шмат пытанняў. Напрыклад, ці ёсць сэнс адкрываць хоспісы ў аддаленых населеных пунктах? Хто будзе займацца падрыхтоўкай персаналу пры перапрафіляванні бальнічных устаноў? Якім павінен быць штат у хоспісаў або аддзяленняў паліятыўнай дапамогі? Наколькі апраўдана адкрываць такія аддзяленні пры анкалагічных дыспансерах? Колькі часу чалавек можа знаходзіцца пад паліятыўнай апекай? Ці патрэбна паведамляць хвораму пацыенту прагноз працягласці яго жыцця? Як не памыліцца з прагнозам? І гэтак далей…

Падбор абязбольвання — таксама цэлая навука. А патрабаванне адэкватнага абязбольвання — гэта фундаментальнае права кожнага хворага. У нас жа паведамляюць пацыенту страшэнны дыягназ, але не заўсёды расказваюць чалавеку, што з ім будзе далей. Хоць кожнаму анкалагічнаму хвораму абавязкова патрэбна падтрымка псіхолага.

Каб атрымаць адказы на злабадзённыя пытанні і даведацца пра сучасныя сусветныя тэндэнцыі ў аказанні паліятыўнай дапамогі, Міністэрства аховы здароўя запрасіла ў Беларусь вопытных амерыканскіх спецыялістаў, якія на працягу чатырох дзён праводзілі на базе РНПЦ анкалогіі тэматычныя семінары для беларускіх медыкаў і выкладчыкаў.

### Законны падмурак

— Анкалогія ва ўсіх нас у першую чаргу асацыюецца з болем: «Я буду пакутаваць, калі буду паміраць». Для анкалагічных хворых галоўнае — гэта абязбольванне і граматны догляд. Сёння ў паліятыўнай дапамозе маюць патрэбу ў Беларусі каля 14,5 тысячы толькі анкалагічных хворых. У нас ёсць і хоспісы, і аддзяленні паліятыўнай дапамогі, і спецыялізаваныя кабінеты ў амбулаторна-паліклінічным звяне, але пакуль не хапае граматных спецыялістаў, здольных аказваць комплексную паліятыўную дапамогу пацыенту і яго сям'і, асабліва ў першасным звяне, — канстатуе **старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў, член пастаяннай парламенцкай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Дзмітрый ШАЎЦОЎ.** — Для таго, каб працаваць з такімі пацыентамі, трэба мець пэўны практычны вопыт работы, а таксама валодаць асаблівымі душэўнымі якасцямі і псіхалагічнай падрыхтоўкай. На жаль, ахоп паліятыўнай дапамогай не перавышае сёння 40% ад агульнай колькасці тых, хто мае ў ёй патрэбу.

**Галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па паліятыўнай дапамозе даросламу насельніцтву, галоўны ўрач «Бальніцы паліятыўнага догляду «Хоспіс» Вольга МЫЧКО** нагадвае, што першы дакумент Міністэрства аховы здароўя па паліятыўнай дапамозе з'явіўся толькі ў 2008 годзе, але датычыўся ён выключна анкалагічных хворых. Разам з тым, вялікім дасягненнем стала абавязковая прысутнасць у хоспісах, акрамя урачоў-анколагаў, тэрапеўтаў, яшчэ і псіхолагаў. Праз два гады выйшаў новы дакумент, які пашырыў кола пацыентаў з хранічнымі захворваннямі ў тэрмінальнай стадыі, на якіх распаўсюдзілася паліятыўная дапамога.

По словах Вольгі Мычко, за прайшоўшы час вельмі шмат было зроблена. Яшчэ з 2007 г. дзейнічае пратакол лячэння болю, які ў 2010 годзе пераглядаўся. Істотна палепшылася даступнасць наркатычных лекавых сродкаў, з'явіліся неінвазіўныя лекавыя формы. У краіне створана структура аказання паліятыўнай медыцынскай дапамогі.

**Ахоп паліятыўнай дапамогай у Беларусі не перавышае сёння 40% ад агульнай колькасці тых, хто мае ў ёй патрэбу.**

Сімвалічна, што ўсяго за некалькі дзён да прыезду амерыканскіх спецыялістаў паліятыўная дапамога, нарэшце, была прапісана і ў беларускім заканадаўстве. Міністэрства аховы здароўя ініцыявала ўнясенне змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя». Новая рэдакцыя дакумента была прынята ў Палаце прадстаўнікоў у другім чытанні. У ёй ужо прапісаны і паняцце «паліятыўная медыцынская дапамога», і прынцыпы яе аказання.

— За ўсім гэтым стаіць вялікая карпатлівая работа па падрыхтоўцы нарматыўна-прававой базы, якая будзе рэгуляваць аказанне паліятыўнай медыцынскай дапамогі, пытанні лекавага менеджменту ў гэтай вобласці, абарот наркатычных і ненаркатычных лекавых сродкаў, развіццё стацыянарнага этапу аказання паліятыўнай дапамогі. Але асноўны ўпор будзе зроблены на амбулаторны этап. Мы імкнёмся да таго, каб кожны ўрач ведаў аспекты аказання паліятыўнай дапамогі і каб кожная медыцынская сястра ведала, як працаваць з такімі пацыентамі, — падкрэсліла **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла ЖЫЛЕВІЧ.**

### Прагнозы — справа няўдзячная?

— Сёння ў ЗША пацыенты атрымліваюць паліятыўную дапамогу адразу пасля пастаноўкі дыягназу паралельна з тэрапіяй, — падзялілася амерыканскім досведам **інструктар Гарвардскай медыцынскай школы, анколаг, урач паліятыўнай медыцыны Сара СЛЭЙТАР** — Мы стараемся ўстанавіць кантакт і прапанаваць падтрымку пацыенту і яго сям'і. Паліятыўная дапамога нацэлена на тое, каб аблегчыць фізічныя, эмацыянальныя, сацыяльныя і духоўныя пакуты на ўсіх стадыях захворвання, і яна не павінна абмяжоўвацца дапамогай смяротна хвораму чалавеку толькі напрыканцы яго жыцця. Заўважана, што ў амерыканскіх пацыентаў, якія атрымлівалі паліятыўную дапамогу на першых стадыях захворвання, працягласць жыцця была большай…

Сара Слэйтар падзялілася вынікамі апытання амаль 500 семя'ў, у якіх былі сваякі са смяротным дыягназам. Высветлілася, што члены сем'яў жадаюць, па-першае, свайго ўключэння ў працэс прыняцця рашэнняў. Яны хацелі б атрымліваць праўдзівую і адкрытую інфармацыю ад медыцынскага персаналу і ўрачоў, мець доступ да сваіх хворых сваякоў 24 гадзіны ў суткі. Таксама ім патрабуецца дапамога і падтрымка дома.

Вельмі паказальна, наколькі адрозніваюцца меркаванні пацыентаў і ўрачоў наконт таго, што пацыенты лічаць важным на парозе смерці. Высокі працэнт хворых жадаюць знаходзіцца перад смерцю ў цвярозым розуме, усведамляць тое, што адбываецца, а вось для ўрачоў гэта не так важна. Смяротна хворыя баяцца быць абузай для сваёй сям'і.

Увогуле, высветлілася, што 47% урачоў не ведалі, чаго хацелі бы іх пацыенты напрыканцы жыцця. У прыватнасці, не ведалі іх стаўлення да інтэнсіўнай тэрапіі, не ведалі, што пацыенты не жадаюць, каб ім аказваліся рэанімацыйныя мерапрыемствы ў выпадку спынення дыхання і сэрцабіцця. А 38% тых, хто пайшоў з жыцця, як мінімум 10 апошніх дзён знаходзіліся ў палаце інтэнсіўнай тэрапіі. Прычым 50% пацыентаў, якія знаходзіліся ў свядомасці, пакутавалі ад болю — ад умеранага да моцнага — прыкладна палову ўсяго часу.

— Мы лічым, што трэба паважаць жаданні пацыентаў напрыканцы іх жыцця. Трэба ставіць перад сабой мэту пазбавіць смяротна хворых людзей ад неадэкватнага і непажаданага медыцынскага ўмяшання, — падкрэслівае Сара Слэйтар.



Яшчэ адна праблема — гэта прагнозы наконт працягласці жыцця смяротна хворых пацыентаў. Гэтыя людзі, як правіла, жадаюць, каб з імі размаўлялі, каб праўдзіва казалі пра іх прагнозы. Але ўрачы не вельмі ахвотна падтрымліваюць такія размовы. 90% амерыканскіх урачоў увогуле пазбягаюць даваць прагнозы, а больш за палову (57%) лічаць, што ў іх не хапае кваліфікацыі для таго, каб рабіць такія прагнозы.

Урачоў, як і пацыентаў, можна зразумець. Недакладнасці ў прагнозах часта становяцца аб'ектам скаргаў пацыентаў і іх сваякоў. Да таго ж, як паказала апытанне 343 амерыканскіх урачоў, 20% прагнозаў, дадзеных імі, аказаліся недакладнымі, а ў 80% выпадкаў прагназуемая працягласць жыцця была пераацэнена. Лічыцца, што даваць прагнозы анкалагічным хворым прасцей, паколькі анкалогія — больш прадказальнае захворванне. Разам з тым заўважана: чым больш даверальныя адносіны складваюцца паміж урачом і пацыентам, тым больш «аптымістычным» атрымліваецца прагноз. Але амерыканскія спецыялісты, якія дзяліліся сваім досведам з беларускімі ўрачамі, лічаць, што больш рэалістычны прагноз дае магчымасць цяжка хворым людзям прымаць своечасова правільныя рашэнні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


ЛИКВИДАТОР ОДО «РЕНАТ-БЕОЛ»
**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ** 13.07.14 г. в 16-00
по адресу: Минск, Хоружей, 31а, оф. 313
**ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СЛЕДУЮЩЕГО ИМУЩЕСТВА ОДО «Ренат-Беол»:**

Пресс гидравлический радиально-обжимной FP120IS «FINN-POWER» – 1 шт., стоимостью 68 102 865 белорусских рублей без НДС; Окорочный станок (машинка для ошкуривания) SP2 «О+Р» – 1 шт., стоимость 4 654 368 белорусских рублей без НДС; Машина для резки заготовки рукава высокого давления ТН 3-3 «Parker» – 1 шт., стоимостью 2 691 726 белорусских рублей без НДС; Электролиз. газосварочная установка «Лига-41» – 1 шт., стоимостью 2 234 129 белорусских рублей без НДС; Станок токарно-винторезный 16К20 – 1 шт., стоимостью 2 760 381 белорусский рубль без НДС; Станок вертикально-сверлильный МН25Л – 1 шт., стоимостью 2 711 864 белорусских рубля без НДС; Станок точильно-шлифовальный NI-2*10 – 1 шт., стоимостью 1 634 245 белорусских рублей без НДС; Станок токарно-винторезный 16К20 – 1 шт., стоимостью 20 709 656 белорусских рублей без НДС;Трубогиб ручной – 1 шт., стоимостью 1 068 244 белорусских рубля без НДС; Станок токарно-винторезный 1К62 – 1 шт., стоимостью 9 091 208 белорусских рублей без НДС. Шаг торгов – 5%. Задаток в размере 10% от стоимости лота перечисляется на расчетный счет 3012250170017 в ЦБУ №540 г. Минск ОАО «Белинвестбанк» МФО 153001739, г. Минск, пр. Машерова, 29; УНП 100961761. На усмотрение Ликвидатора оплата покупателем предмета торгов производится на основании договора уступки права требования (перевода долга) в счет оплаты Продавцом расходов, связанных с ликвидацией.Имущество может быть продано единственному участнику торгов. Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220002, Минск, а/я 33 в срок по 01.07.14 г. Договор купли-продажи (уступки требования) должен быть заключен в трехдневный срок с даты проведения торгов, а приобретенное имущество должно быть оплачено в течение трех дней с момента подписания договора.

**Справки по телефону 8 017 289-58-88.**
Место нахождения имущества: г. Минск. УНП 191228804



**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

по объекту «Многоквартирный жилой дом со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения по генплану № 11 в границах пр. Дзержинского, пр. Любимова, ул. Семашко. Жилой дом № 11 по генплану. 1-я очередь строительства, *опубликованную в газете «Звязда» 13.12.2012 года»*

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «Фармэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, пер. Червякова, дом 21А, пом. 5, каб. 3.

**Тел. 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029)708 46 64.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц:

Стоимость 1 кв.м. 2-комнатных квартир площадью 54 м² при оплате в рассрочку 1550 (одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США, при условии 100% единовременной оплаты стоимость 1500 (Одна тысяча пятьсот) долларов США.

Стоимость неизменна до окончания строительства. Оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. УНП 101472333


БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ

ОАО «Банк БелВЭБ»

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 марта 2014 года)

| | 31.03.2014 (неаудировано) | 31.12.2013 |
|---|---|---|
| **Активы** | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 2 022 255 | 1 958 470 |
| Драгоценные металлы | 11 597 | 13 167 |
| Производные финансовые активы | 118 | 40 |
| Средства в кредитных организациях | 273 857 | 786 092 |
| Кредиты клиентам | 14 478 096 | 14 440 109 |
| Инвестиционные ценные бумаги, имеющиеся в наличии для продажи | 1 879 765 | 2 011 812 |
| Инвестиции в ассоциированную компанию | 36 214 | 35 892 |
| Основные средства | 925 691 | 926 708 |
| Активы, построенные для продажи | 179 009 | 199 833 |
| Нематериальные активы | 162 769 | 152 634 |
| Текущий актив по налогу на прибыль | 595 | 63 974 |
| Отложенные активы по налогу на прибыль | 281 | 11 776 |
| Прочие активы | 254 670 | 267 460 |
| **Итого активы** | **20 224 917** | **20 867 967** |
| **Обязательства** | | |
| Средства кредитных организаций | 9 797 515 | 10 754 208 |
| Производные финансовые обязательства | | 34 |
| Средства клиентов | 6 702 026 | 6 618 797 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 90 362 | 19 125 |
| Текущие обязательства по налогу на прибыль | 27 749 | 94 942 |
| Отложенные обязательства по налогу на прибыль | 18 328 | 8 502 |
| Прочие обязательства | 406 175 | 221 744 |
| **Итого обязательства** | **17 042 155** | **17 717 352** |
| **Капитал** | | |
| Уставный капитал | 4 271 353 | 4 271 353 |
| Эмиссионный доход | 4 135 | 4 135 |
| Дополнительный капитал | 49 529 | 49 529 |
| Фонд переоценки зданий | 167 220 | 167 220 |
| Нереализованная переоценка инвестиционных ценных бумаг, имеющихся в наличии для продажи | 1 877 | 3 348 |
| Накопленный дефицит | (1 397 945) | (1 423 132) |
| Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка | 3 096 169 | 3 072 453 |
| Неконтрольные доли участия | 86 593 | 78 162 |
| **Итого капитал** | **3 182 762** | **3 150 615** |
| **Итого капитал и обязательства** | **20 224 917** | **20 867 967** |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

ОАО «Банк БелВЭБ»

**за период, закончившийся 31 марта 2014 года**

(в миллионах белорусских рублей с учетом покупательной способности белорусского рубля на 31 марта 2014 года)

| | За 3 месяца, закончившихся 31.03.2014 (неаудировано) | За 3 месяца, закончившихся 31.03.2013 |
|---|---|---|
| **Процентные доходы:** | | |
| Кредиты клиентам | 543 824 | 486 754 |
| Средства в кредитных организациях | 8 110 | 27 094 |
| Инвестиционные ценные бумаги | 36 876 | 27 343 |
| | **588 810** | **541 191** |
| Финансовая аренда | 3 823 | 3 332 |
| | **592 633** | **544 523** |
| **Процентные расходы:** | | |
| Средства кредитных организаций | (134 091) | (148 548) |
| Средства клиентов | (114 685) | (111 513) |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | (2 035) | (30 810) |
| | **(250 811)** | **(290 871)** |
| **Чистые процентные доходы** | **341 822** | **253 652** |
| Эффект первоначального признания активов, по которым начисляются проценты | 1 945 | (2 234) |
| Резерв под обесценение кредитов | (56 426) | (18 194) |
| **Чистые процентные доходы после (создания)/восстановления резерва под обесценение кредитного портфеля** | **287 341** | **233 224** |
| Доходы по сборам и комиссионным | 133 997 | 118 357 |
| Расходы по сборам и комиссионным | (78 547) | (33 236) |
| **Чистые комиссионные доходы** | **55 450** | **85 121** |
| Чистые доходы по операциям с инвестиционными ценными бумагами, имеющимися в наличии для продажи | 1 379 | 27 866 |
| Чистые доходы по операциям в иностранной валюте: | | |
| - торговые операции | 22 860 | 13 308 |
| - переоценка валютных статей | 3 383 | 14 884 |
| Доля в прибыли ассоциированной компании | 322 | 2 050 |
| Прочие доходы | 77 358 | 58 938 |
| **Непроцентные доходы** | **105 302** | **117 046** |
| Расходы на персонал | (105 840) | (92 028) |
| Помещения и оборудование | (22 289) | (19 648) |
| Амортизация | (13 556) | (12 420) |
| Налоги, кроме налога на прибыль | (5 422) | (3 531) |
| Прочие расходы от обесценения и создания резервов | (391) | - |
| Прочие операционные расходы | (68 117) | (92 828) |
| **Непроцентные расходы** | **(215 615)** | **(220 455)** |
| **Прибыль до расходов по налогу на прибыль и убытка по чистой денежной позиции** | **232 478** | **214 936** |
| Убыток по чистой денежной позиции в связи с гиперинфляцией | (84 198) | (91 091) |
| Расходы по налогу на прибыль | (52 554) | (52 876) |
| **Чистая прибыль** | **95 726** | **70 969** |
| В том числе приходящаяся на: | | |
| - акционеров Банка | 87 295 | 66 113 |
| - неконтрольные доли участия | 8 431 | 4 856 |

**Председатель Правления** **Каллаур П. В.**
**Главный бухгалтер** **Филиппова Л. А.**
**22 мая 2014 г.**

**Финансовая отчетность размещена на сайте** www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2014 год.

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 № 6. УНП 100010078.

## ГРОДНЕНСКИЙ ФИЛИАЛ
## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
